ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 21 (5027) 31 мая 2019 г. ISSN 0024-4686

16 +

Суполка неаб'яднаных стар. 4

Паэтычныя галасы Украіны стар. 11

«Арт-Мінск»: ёсць пытанні стар. 12

Лета — гэта цэлы сусвет

Адзвінеў апошні ў вучэбным годзе званок, і шчаслівыя навучэнцы радасна пакідаюць класы ў прадчуванні летніх прыгодаў. Не менш шчаслівыя і іх бацькі: можна зрабіць перадых з абавязковымі хатнімі заданнямі, падрыхтоўкамі да кантрольных. Але за першым пачуццём радасці надыходзіць і заклапочанасць: як арганізаваць час дзіцяці, каб яно не сумавала?

Падказку вы знойдзеце на старонках крытыкі: прапануем павандраваць па адметных мясцінах нашай Бацькаўшчыны, а таксама ўзняцца вышэй ад зор на крылах фантазіі разам з беларускімі пісьменнікамі...

Працяг тэмы на стар. 6—7 ►

Фота Кастуся Дробава.

ISSN 0024-4686

акцэнты тыдня

Медыяфорум. XIV Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства ў імя будучыні: журналістыка і сацыяльная абарона грамадства», які праходзіў у Брэсце, сабраў дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, дыпламатаў, прадстаўнікоў экспертнай і медыйнай супольнасці, журналістаў з 25 краін. «Нашы народы здзейснілі вялікі подзвіг, абаранілі ў той вайне сваю свабоду і незалежнасць, таму што былі разам», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў прывітанні ўдзельнікам і гасцям форуму. «Сёння мы таксама разам павінны зберагчы агульную гісторыю, не дапусціць перагляду і фальсіфікацыі гераічнага мінулага. Зрабіць не толькі прафесійны, але і глядацкі, чытацкі выбар на карысць журналістыкі праўды, справядлівасці і аб'ектыўнасці», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Даты. Прэзідэнт Беларусі павіншаваў калектыў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы з 75-годдзем з дня яго заснавання. «Адпавядаючы высокім патрабаванням часу, установа дастойна выконвае сваю місію па даследаванні, захаванні і папулярызацыі гістарычных і сучасных духоўных каштоўнасцей беларусаў», — гаворыцца ў віншаванні. Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння музей — сапраўдная скарбніца жыццёвай і творчай спадчыны класіка айчыннай культуры. Унікальныя экспазіцыі яго залаў, разнастайныя выстаўкі і адукацыйныя праграмы раскрываюць перад наведвальнікамі шматгранны вобраз Янкі Купалы. Кіраўнік дзяржавы выказаў словы ўдзячнасці калектыву музея за штодзённую руплівую працу і адданае служэнне роднай Беларусі.

Стасункі. Дні культуры Камбоджы праходзяць у Беларусі гэтымі днямі, паведамілі ў Міністэрстве культуры. Урачыстая цырымонія адкрыцця адбылася ў Белдзяржфілармоніі, дзе выступілі харэаграфічны калектыў і салісты-інструменталісты з Камбо-джы. Такі ж канцэрт прадугледжаны праграмай і ў Палацы культуры г. Маладзечна. Напярэдадні дэлегацыя гасцей, якую ўзначальвае міністр культуры і вытанчаных мастацтваў Фоерэнг Сакона, сустрэлася з міністрам культуры Беларусі Юрыем Бондарам. Дні культуры Беларусі ў Камбоджы праходзілі ў маі 2017 года.

Навука. Міжнародны навукова-практычны форум «Мастацкая прастора Еўропы XIX—XX стагоддзяў і Станіслаў Манюшка: гісторыя, сучасны стан» праходзіць у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Форум ахоплівае мастацтвазнаўчую, культуралагічную, краязнаўчую, сацыялагічную праблематыку, актуальныя навуковыя пытанні, звязаныя з новымі ракурсамі даследавання творчасці Станіслава Манюшкі, вывучэннем культуры Беларусі ў еўрапейскім кантэксце, увекавечаннем памяці выдатных дзеячаў культуры і мастацтва ў Беларусі і свеце. Да ўдзелу запрошаны вядучыя спецыялісты з Беларусі, Польшчы, Літвы, Расіі, Украіны, Казахстана, Малдовы. Падрыхтаваны цікавыя кніжныя выстаўкі. У праграме — наведванне памятных мясцін.

Прысвячэнне. Нацыянальны фільм «Янка Купала» рэжысёра Уладзіміра Янкоўскага плануецца прадставіць грамадскасці ў Дзень беларускага кіно — 17 снежня, паведаміў журналістам генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Карачэўскі. Гістарычная драма раскрывае асноўныя вехі жыццёвага і творчага шляху паэта, які супаў з найбольш трагічнымі падзеямі XX стагоддзя. Трэйлер «Янкі Купалы» ёсць на англійскай, беларускай і кітайскай мовах. Афіша распрацоўваецца сумесна з беларускім мастаком і дызайнерам Уладзімірам Цеслерам.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

супрацоўніцтва

«Няма для духа вольнага граніцы…»

Ва Улан-Батары пабачыла свет кніга санетаў народнага песняра Беларусі Янкі Купалы на трох мовах — мангольскай, беларускай і рускай. Перакладчык — спадар Б. Галаарыд, вядомы мангольскі літаратар.

Яшчэ ў 1964 годзе ў Манголіі выйшла паэма Я. Купалы «Над ракой Арэсай». Сёлетні зварот да творчай спадчыны класіка беларускай літаратуры — частка той працы, якая з'яўляецца складнікам беларуска-мангольскіх літаратурных сувязяў на сучасным этапе. У перастварэнні легендарнага купалаўскага цыкла санетаў спадару Галаарыду істотную дапамогу аказаў Літаратурны музей Янкі Купалы, асабіста — дырэктар музея Алена Раманаўна Ляшковіч.

У кнізе змешчаны дзве прадмовы: з мангольскага боку і ад Беларусі. А таксама — як пасляслоўе ад перакладчыка. У гэтым артыкуле — згадкі пра ключавыя, найболей істотныя моманты ў творчай і жыццёвай біяграфіі Янкі Купалы.

— Я і надалей буду займацца творчасцю Купалы, — сцвярджае мангольскі літаратар, які днямі прыехаў у Мінск, каб паўдзельнічаць у традыцыйным Беларускім медыяфоруме, на які сабраліся госці з 25 краін свету. — Мяне зацікавілі славутыя купалаўскія паэмы — «Курган», «Магіла льва», «Бандароўна». Рады, што пазнаёміўся з сучасным беларускім паэтам Алесем Бадаком, кіраўніком выдавецтва «Мастацкая літаратура». Пабываў я і ў Купалаўскім музеі на беразе Свіслачы. Уражаны той цеплынёю, з якою вы, беларусы, захоўваеце памяць пра свайго нацыянальнага прарока. Як на мой погляд, то менавіта праз класічную літаратуру нашы народы болей зразумеюць, адкрыюць адзін аднаго.

Сяргей ШЫЧКО

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Дыпламатыя слова

Дом літаратара ў Мінску — месца, добра вядомае ў колах не толькі творчых, але і ў дыпламатычных. Нядаўна пісьменніцкую арганізацыю наведала дэлегацыя беларускіх дыпламатаў, якія ў розныя гады выконвалі прадстаўнічую місію нашай краіны ў розных кутках свету, наладжвалі дзелавыя і культурныя стасункі новай незалежнай Беларусі.

Цяпер яны маюць вялікі прафесійны, дыпламатычны і жыццёвы досвед. З'яднаныя ў грамадскую арганізацыю ветэранаў Міністэрства замежных спраў, працягваюць працаваць на ўмацаванне іміджу Беларусі, дзеляцца ўспамінамі і ўражаннямі пра час знаходжання за мяжой. Аповеды з першых вуснаў пра асаблівасці розных краін, менталітэт іх народаў, тонкасці дыпламатычнага пратакола заўсёды цікавыя. Для тых, хто набывае прафесію, звязаную з замежнымі стасункамі, інфармацыя наогул вельмі карысная.

Сустрэча ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі насіла характар больш сяброўскі, чым дзелавы. Намеснік старшыні ветэранскай арганізацыі МЗС Аляксей Можухаў прапанаваў старшыні СПБ Мікалаю Чаргінцу сустрэцца, каб паразмаўляць пра былое, а нешта з успамінаў — занатаваць. Мікалай Іванавіч з улікам ранейшай работы на пасадзе старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы меў шчыльныя стасункі з дыпламытычным корпусам краіны. Цяпер гэта ўжо гісторыя — гісторыя ў асобах.

За круглым сталом у мемарыяльнай зале СПБ адбылася прыязная і карысная гаворка. Мікалай Чаргінец згадаў пра многае з таго, што спрыяла зацвярджэнню Беларусі на міжнароднай арэне і асабліва падкрэсліў той факт, што кожны, каму выпала надзвычай адказная справа — прадстаўляць Беларусь, яе інтарэсы ў свеце, — рабіў гэта сумленна, браў на сябе адказнасць прымаць іншым часам няпростыя рашэнні.

Знакавы момант сустрэчы — прэзентацыя фотакнігі «Лонданская школа дыпламатычнага пратакола», створанай жонкай былога пасла Рэспублікі Беларусь у Злучаным Каралеўстве Вялікабрытанія і Паўночная Ірландыя і Рэспубліцы Ірландыя па сумяшчальніцтве Людмілы Можухавай. Выданне ўтрымлівае больш як 130 найцікавейшых фотаздымкаў, якія сведчаць пра работу беларускага дыпламата.

Марыя ЛІПЕНЬ

Паэзія вядзе

Вышэйшую ўзнагароду Мінскага гарадскога аддзялення СПБ — медаль «Максім Багдановіч» — уручыў Міхась Пазнякоў старшыні Астраханскага аддзялення СП Расіі Юрыю Шчарбакову за яго ўклад у развіццё творчых сувязяў і перакладчыцкую дзейнасць, прапаганду класічнай і сучаснай беларускай літаратуры ў Расіі. Адбылося гэта падчас першага літаратурнага фестывалю для дзяцей і моладзі. Фэст з удзелам пісьменнікаў, мастакоў і выдаўцоў з Расіі, Беларусі, Азербайджана, Ірана ладзіўся ў Астрахані.

Па запрашэнні Міністэрства культуры і турызму Астраханскай вобласці Расіі, Пасольства Беларусі ў Расійскай Федэрацыі і Астраханскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Расіі ад нашай краіны ў ім бралі ўдзел старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшыня таварыства дружбы «Беларусь — Расія» Міхась Пазнякоў і вядучы спецыяліст гарадскога аддзялення, мастацкі кіраўнік Тэатра паэзіі Вольга Багушыньска.

Госці з Беларусі распавядалі аб творчым жыцці ў нашай краіне, дзейнасці СПБ, бралі ўдзел ва ўрачыстым адкрыцці фестывалю, «Чытацкай лавы», выказвалі свае меркаванні на круглым стале «Дружба літаратур — дружба народаў». Творчасці Міхася Пазнякова і дзейнасці Мінскага гарадскога тэатра паэзіі была прысвечана сустрэча з вучнямі школы ў Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы г. Красны Яр. Гучалі вершы як на рускай так і на беларускай мовах. М. Пазнякоў падарыў бібліятэцы некалькі сваіх кніг.

Падчас круглага стала «Класікі і сучаснікі: хто каго?» Міхась Пазнякоў распавёў пра дзяржаўную падтрымку кнігавыдання ў нашай краіне, супрацоўніцтва СПБ з установамі адукацыі і культуры.

Міхась Пазнякоў і Вольга Багушыньска падчас творчай сустрэчы з чытачамі г. Астрахані.

У літаратурнай гасцёўні Тэатральнага парка адбылася творчая сустрэча Міхася Пазнякова з гараджанамі. Вёў яе Юрый Шчарбакоў, які неаднаразова ўдзельнічаў у рабоце Мінскай міжнароднай выстаўкі-кірмашу, пераклаў на рускую мову нямала вершаў беларускіх паэтаў, у тым ліку і кнігу М. Пазнякова «Маё багацце», якая выйшла летась у Расіі.

Павел КУЗЬМІЧ, фота аўтара

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

3 чэрвеня *— на сустрэчу Міхася Пазнякова з юнымі чытачамі ў Цэнтральную Мінскую гарадскую бібліятэку імя Янкі Купалы (10.30).*

4 чэрвеня *— у Школу юнага паэта пры гарадскім аддзяленні (14.00).*

5 чэрвеня *— на сустрэчу з Алінай Легастаевай у Дзіцячы дом № 5 (15.00).*

6 чэрвеня *— на свята паэзіі «Я помню дзіўнае імгненне», прысвечанае 220-годдзю з дня нараджэння А. С. Пушкіна, у Дом дружбы (17.00).*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

4 чэрвеня *— на гадзіну пытанняў і адказаў «У гасцях у Дзеда Прыродаведа» з Галінай і Сяргеем Трафімавымі ў Арэхаўскую гарпасялковую бібліятэку Аршанскага раёна (11.00).*

4 чэрвеня *— на сустрэчу «Нябесная заступніца Беларусі» з удзелам Пятра Буганава ў Полацкую бібліятэку імя Ф. Скарыны (16.00).*

5 чэрвеня *— на пазнавальную гадзіну «Дзед Прыродавед аб тайнах і загадках прыроды» з Галінай і Сяргеем Трафімавымі ва Усценскую гарпасялковую бібліятэку Аршанскага раёна (11.00).*

6 чэрвеня *— на мітынг, прысвечаны 220-годдзю з дня нараджэння А. С. Пушкіна, з удзелам Тамары Красновай-Гусачэнкі, віцебскіх паэтаў і пераможцаў конкурсу «Души прекрасные порывы-2019» каля помніка А. С. Пушкіну ў г. Віцебску (11.00).*

6 чэрвеня *— на літаратурную сустрэчу «Чароўнае спагадлівае лета» з Галінай Загурскай і Мікалаем Балдоўскім у летні лагер адпачынку пры гімназіі № 1 імя Ф. Скарыны г. Полацка (11.00).*

7 чэрвеня *— на літаратурную сустрэчу «Табе, радзімая старонка» ў летні лагер адпачынку СШ № 8 г. Полацка (11.00).*

7 чэрвеня *— на пазнавальны час «Усё аб прыродзе» з Галінай і Сяргеем Трафімавымі ў Засеклянскую сельскую бібліятэку Аршанскага раёна (11.00).*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

5 чэрвеня *— на фінал абласнога літаратурнага конкурсу «Беларусь алімпійская», прысвечанага II Еўрапейскім гульням, у Гродзенскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі (12.00).*

6 чэрвеня *— на сустрэчу Людмілы Кебіч з бібліятэкарамі вобласці на тэму «Гродзеншчына літаратурная» ў Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў (10.40).*

Мінскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

1 чэрвеня *— на прэзентацыю новага агульнагарадскога зборніка дзіцячай творчасці «Зорны россып», з удзелам старшыні абласнога аддзялення Святланы Быкавай, у Дзіцячы парк г. Заслаўя (13.00).*

6 чэрвеня *— на сустрэчу Ірыны Карнаухавай з вучнямі пачатковых класаў у межах праекта «Лета з добрай кнігай» у Мінскі раённы цэнтр культуры (г. Мінск, вул. Вышалескага, 4) (10.30).*

7 чэрвеня *— на канцэрт «Мой родны кут, як ты мне мілы», які адбудзецца ў межах XIX Нацыянальнага фестывалю беларускай паэзіі і музыкі, у Маладзечанскую дзіцячую школу мастацтваў (15.00).*

фестывалі

Спеў пра галоўнае

XIX Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна-2019» вабіць разнастайнай праграмай. Галоўныя дзейныя асобы на гэтым дзівосным свяце — не толькі майстры выканаўчага майстэрства, але і мэтры — паэты, чые радкі напаўняюць сэрца хваляваннем.

Асаблівасць сёлетняга ўдзелу Саюза пісьменнікаў Беларусі ў гэтай культурнай падзеі нашай краіны ў тым, што Маладзечна наведае каманда з двух дзясяткаў творцаў. Яны прадставяць галоўны кірунак свята: прысвячэнне мастацкага слова 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і любай для ўсіх творцаў тэме — Году малой радзімы.

7 ліпеня на розных пляцоўках Маладзечна будзе лунаць роднае слова. Гэта стане своеасаблівым паэтычным бенефісам СПБ на нацыянальным фэсце песні і паэзіі.

Першы выхад на сцэну паэтаў творчага саюза адбудзецца а 15 гадзіне. Канцэртную праграму для прадстаўлення ў Маладзечанскай дзіцячай школе мастацтваў рыхтуе Мінскае абласное аддзяленне СПБ. «Мой родны кут, як ты мне мілы!» — такую назву паэты Міншчыны далі літаратурнай імпрэзе, прысвечанай самым дарагім мясцінам. Святлана Быкава ўсхваляе роднае Заслаўе, Уладзімір Цанунін славіць Вілейшчыну, Уладзімір Краскоўскі — Валожыншчыну, Лёля Багдановіч — Барысаў, Таццяна Цвірка — Клецк, Марыя Шыбанец — Маладзечна.

А 16-й гадзіне фестываль упершыню прыме аўтарскую праграму паэта Навума Гальпяровіча «Суразмоўцы», якая стала знакавай з'явай у эфіры тэлеканала «Беларусь 3». Гэтым разам Навум Якаўлевіч у якасці госця запросіць паэта-песенніка Уладзіміра Мазго, з асобай якога звязана гісторыя фестывальнага руху, распачатага ў чэрвені 1993 года. У. Мазго быў удзельнікам першага фэсту, дзе гучалі ажно пяць песень аўтара. Варта нагадаць і пра тое, што Анжаліка Ют, выканаўшы ў конкурсе маладых выканаўцаў песню на словы У. Мазго «Лістота разлук», стала ўладальніцай першай прэміі. Андрэй Хлястоў спяваў «Трохвугольнік», а Іна Афанасьева прадстаўляла «Варажбу», якая ўжо стала хітом. Уладзімір Мазго, дарэчы, у свой юбілейны год, і цяпер поўны творчага запалу і рады прадставіць прэм'еру новай песні — «Жаўруковая мова».

А таксама героем аўтарскай праграмы Навума Гальпяровіча будзе беларускі драматург Аляксей Дудараў.

Чакаецца яшчэ адна яркая падзея: у 17.30 у канцэртнай зале Палаца культуры пройдзе музычна-паэтычная гасцёўня «Пад небам Бацькаўшчыны роднай» з удзелам паэтаў, дзеячаў культуры і мастацтва Беларусі.

Паэты СПБ будуць прэзентаваць кнігу «Мая Радзіма», якая пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». Пад адной вокладкай сабраны вершы-прызнанні ў любові Айчыне. Сваё захапленне радзімай перададуць маладзечанскаму гледачу і майстры прыгожага мастацкага слова. Сярод іх — лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міхась Башлакоў, Мікола Мятліцкі, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Міхась Пазнякоў, паэты, чые словы гучаць на прасторах Радзімы — Сяргей Давідовіч, Вадзім Спрынчан, Кастусь Цыбульскі, Змітрок Марозаў.

Да таго ж госцем музычна-паэтычнай гасцёўні «Пад небам Бацькаўшчыны роднай» стане Нацыянальны акадэмічны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча.

Алена СТЭЛЬМАХ,
першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі

стасункі

Пераклад, які аднае

Літаратурны вечар «Таджыкская паэзія: вытокі і сучаснасць» з удзелам Пасольства Рэспублікі Таджыкістан у Рэспубліцы Беларусь прайшоў у Доме дружбы. Саветнік, Часовы паверaны па справах Рэспублікі Таджыкістан у Рэспубліцы Беларусь, доктар філалагічных навук Салім Хатлані падкрэсліў: літаратура аб'ядноўвае народы, а твораў, якія родняць Беларусь і Таджыкістан, вельмі шмат:

— Літаратурныя пераклады — аснова культурных адносін краін. Яшчэ ў 60-я гг. XX стагоддзя мы выхоўваліся ў тым духу мужнасці, які нам перадала гісторыя пра дзеда Талаша. З таго часу змянілася шмат. Але не традыцыя ўзаемных перакладаў. У гэтым рэчышчы трэба згадаць пра пераклад на таджыкскую мову цудоўных вершаў Міколы Мятліцкага. Ён ужо крыху і наш паэт.

Арганізатары і ўдзельнікі звярталі ўвагу на важнасць літаратурнага дыялогу, якія становяцца магчымым у тым ліку дзякуючы вечарам паэзіі. Ды і сучаснасць лепш зразумець дапамагае неацэнны досвед, які перадалі Джамі, Саадзі, Хафіз, Фірдаўсі, Кісаі, Хаям… Галоўнае — чытаць!

Яўгенія ШЫЦЬКА

Свята вершаў і прозы

У Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Янкі Купалы г. Мінска адбылося адметнае літаратурнае свята — падвядзенне вынікаў гарадскога конкурсу чытальнікаў класічнай і сучаснай паэзіі і прозы Беларусі. Творчае спаборніцтва доўжылася амаль паўгода.

Арганізатарам выступіла Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, спонсарам — Асацыяцыя абароны інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд». Першы этап конкурсу праходзіў у школах, гімназіях, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах. Потым найлепшых чытальнікаў праслухоўвала журы, у склад якога ўваходзілі пісьменнікі, выкладчыкі мастацкіх дысцыплін, артысты.

Гэтым разам колькасць удзельнікаў наблізілася да тысячы. Як зазначыў старшыня журы Міхась Пазнякоў, сёлета конкурс ахапіў усе ўзроставыя катэгорыі — ад дашкольнікаў да моладзі. Значна ўзрасла падрыхтаванасць канкурсантаў. Праслухоўванне адбывалася ў музеі Якуба Коласа ў некалькі этапаў і адборачных тураў.

Найбольшую актыўнасць праявілі вучні сталічных гімназіі № 35, СШ № 168 і 200, студэнты Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.

У выніку журы вызначыла 13 уладальнікаў Гран-пры і 16 лаўрэатаў. Ім былі ўручаны дыпломы, імянныя статуэткі і медалі, памятныя падарункі. Найлепшыя з пераможцаў возьмуць удзел у мерапрыемствах «Славянскага базару» ў Віцебску.

Сярод пераможцаў конкурсу чытальнікаў паэзіі і прозы з ліку дашкольнікаў — выхаванец дзіцячага сада № 499 Роберт Багушыньскі, сярод вучняў малодшых класаў — Меланія Якімова і Уладзіслаў Салавей (гімназія № 35), Ксенія Нікольская (СШ № 151), Соф'я Гарошка (СШ № 146), сярод вучняў сярэдняга школьнага ўзросту — Дарына Ананіч (гімназія № 35), Дар'я Абрамава (СШ № 26), Вікторыя Лявонава і Ганна Вінакурава (СШ № 168). Сярод вучняў старэйшых класаў — Аліна Сухадольская (гімназія № 7), Анастасія Кастэнка (СШ № 168), сярод навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў — Яраслаў Мяркулаў (Мінскі дзяржаўны энергетычны каледж), сярод студэнтаў — Анастасія Чайкоўская (БДПУ імя М. Танка), Іван Піскун і Арцём Лісай (БДУІР), сярод моладзі — Анастасія Елісеева (супрацоўнік БДУІР).

Павел КУЗЬМІЧ

ЛіМ КАЛЯНДАР

2 чэрвеня — 95 гадоў з дня нараджэння Веры Кабатнікавай (1924—1997), беларускай і рускай актрысы, заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь.

2 чэрвеня 80-годдзе святкуе Раіса Частнова, мастацтвазнаўца, журналістка.

4 чэрвеня 80 гадоў спаўняецца Аляксандру Акуліку, публіцысту.

4 чэрвеня 70-гадовы юбілей адзначае Анатоль Сакалоў, мастак.

5 чэрвеня — 165 гадоў з дня нараджэння Юдаля Пэна (1854—1937), мастака, педагога.

5 чэрвеня 75-годдзе святкуе Валерый Анісенка, акцёр, рэжысёр, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

6 чэрвеня 80-гадовы юбілей адзначае Эрнст Трыкоза, майстар манументальнага, дэкаратыўна-ўжытковага і афармленчага мастацтва, мастак.

7 чэрвеня 80 гадоў спаўняецца Уладзіміру Скарынкіну, паэту, перакладчыку.

люстэрка тыдня

Юбілей Станіслава Манюшкі шырока святкуецца не толькі ў Беларусі. Пастаянным прадстаўніцтвам Беларусі пры ЮНЕСКА сумесна з пастаяннымі прадстаўніцтвамі Польшчы і Румыніі арганізаваны ўрачысты канцэрт у Штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы, паведамляе Пасольства Беларусі ў Францыі. У канцэрце ўзялі ўдзел беларускія музыканты з Гродна Ганна Голуб, Аляксей і Святаслаў Пятровы, якія выканалі паланэзы і мазуркі С. Манюшкі, а таксама арыю з оперы «Зачараваны замак». Канцэрт быў арганізаваны пры актыўнай падтрымцы дзвюх грамадскіх арганізацый беларусаў у Францыі — асацыяцыі «Жыццё ў музыцы» і «Асацыяцыі франка-беларускага сяброўства».

Стала вядома, што юбілейны X Міжнародны музычны фестываль «Вялікая бард-рыбалка» пройдзе 26—28 ліпеня ў пасёлку Грудзічына Быхаўскага раёна на беразе Чыгірынскага вадасховішча, паведамляе БелТА. Фэст, які стартаваў у 2010 годзе, стаў візіткай музычна-фестывальнага жыцця Магілёўскай вобласці. На творчых пляцоўках свята выступяць музыканты з Беларусі, а таксама Расіі, Украіны, Польшчы, Чэхіі, Літвы, Эстоніі і ўпершыню з Іспаніі. У юбілейнай праграме запланаваны сольныя канцэрты і творчыя праекты з удзелам зорак аўтарскай песні, джазавых і эстрадна-інструментальных ансамбляў.

Аўжо ў гэтыя выходныя ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту адбудзецца V Фестываль гістарычнай рэканструкцыі «Эпоха рыцарства», паведамляюць арганізатары. Асноўная ідэя фэсту — паказ гісторыі заходнееўрапейскага і беларускага Сярэдневечча: гістарычная рэканструкцыя турніраў і бітваў рыцараў, сярэдневяковай музыкі і танцаў, паходнага побыту. Гасцей чакаюць відовішчныя спаборніцтвы рыцараў, рыцарскі лагер і кірмаш рамеснікаў, свае ўменні прадэманструюць сярэдневяковыя музыкі, вулічны тэатр, танцавальныя калектывы.

У Бакінскім кніжным цэнтры адбылася прэзентацыя кнігі індыйскага гуру, містыка і майстра ёгі Свамі Шывананды «Ёга і сіла думкі» на азербайджанскай мове. Як паведамляе АЗЕРТАДЖ, ініцыятар праекта, аўтар ідэі і прадмовы да кнігі — віцэ-прэзідэнт Фонду Гейдара Аліева Лэйла Аліева. Упершыню выдадзеная на азербайджанскай мове ў вытанчаным афармленні кніга «Ёга і сіла думкі» адлюстроўвае розныя аспекты філасофіі і практыкі ёгі. Яна перакладзена на шматлікія мовы міру і займае важнае месца ў гісторыі духоўнай спадчыны, падкрэслена падчас прэзентацыі.

Тым часам у Берліне з поспехам прайшлі гастролі маскоўскага «Гогаль-цэнтра» пад кіраўніцтвам Кірыла Сярэбранікава. Гледачы з цікавасцю ўспрынялі спектакль на аснове паэмы М. А. Някрасава «Каму на Русі жыць добра», інфармуе ТАСС. Гастролі ў Берліне — заўсёды цікавы эксперымент і важны іспыт, адзначае мастацкі кіраўнік тэатра. Тут усе апантаныя тэатрам, выдатна разбіраюцца ў ім. Гэтым разам на сцэне *Deutsche Theater* адбыўся двайны эксперымент — спектакль у выглядзе 4 гадзін паэзіі з нямецкімі субцітрамі. Квіткі былі цалкам распрададзеныя за месяц наперад.

Музей Луўра ў сталіцы Францыі вырашана было зачыніць з-за забастоўкі супрацоўнікаў у сувязі з небывалым наплывам наведвальнікаў. Як паведамляе РІА Навіны, з-за пратэсту супрацоўнікаў па абслугоўванні наведвальнікаў, якія рэалізавалі права на забастоўку, на пачатку тыдня музей застаўся зачынены. У заяве прафсаюза *South Culture Solidaires* значыцца, што Луўр літаральна «задыхаецца». Як паведамлялася, летась Луўр устанавіў рэкорд па ліку наведвальнікаў: ахвотных зірнуць на сусветныя шэдэўры было больш чым 10 млн чалавек.

Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ

землякі

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

У ПОШУКАХ АСАБІСТАЙ ПРАСТОРЫ

З Алегам Ладзісавым я пазнаёміўся ў Полацку яшчэ на пачатку васьмідзясятых гадоў мінулага стагоддзя. Было гэта ў гарадской карціннай галерэі, створанай па ініцыятыве загадчыцы аддзела культуры гарвыканкама Таццяны Рудавай. Невысокі хударлявы малады чалавек уразіў мяне сваёй эрудыцыяй, выдатнай беларускай мовай. Алег Іванавіч працаваў тады загадчыкам сектара выяўленчага мастацтва Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка, і яго лекцыі ды экскурсіі па галерэйнай экспазіцыі былі для многіх па-сапраўднаму яркія і захапляльныя. І нават здагадацца было цяжка, што на той час Ладзісаў быў, так бы мовіць, самавукам: прафесію настаўніка, якую атрымаў у інстытуце замежных моў, але мастаком Алег марыў быць з дзяцінства.

Алег нарадзіўся ў Обалі, што на Шуміліншчыне, непадалёк ад Полацка. У сям'і было трое хлопцаў. І толькі малодшы Алег марыў стаць мастаком. Першы раз спроба паступіць у тэатральна-мастацкі інстытут была няўдалая, але ўсё ж такі Ладзісаў паступіў у жаданую навучальную ўстанову і паспяхова яе скончыў.

У полацкай галерэі ў многім яго намаганнямі была створана выдатная калекцыя сучаснага выяўленчага мастацтва. Але самым галоўным для Алега стаў удзел у створаным у горадзе творчым аб'яднанні мастакоў, куды ўвайшлі Сяргей Цімохаў, Аляксандр Канавалаў, Ігар Куржалаў, муж і жонка Васільевы. Дарэчы, іх імёны сёння добра вядомыя аматарам выяўленчага мастацтва.

Дваццаць гадоў Ладзісаў быў звязаны з Полацкай карціннай галерэяй, мясцовай дзіцячай мастацкай школай, дзе выкладаў жывапіс, кампазіцыю, гісторыю мастацтва.

А ў 2003 годзе разам з сям'ёй пераехаў у Мінск. Жонка Галіна, музейны работнік, была запрошана ў Міністэрства культуры, а Алег Іванавіч стаў працаваць вучоным сакратаром рэспубліканскага гістарычнага музея. Мне было прыемна зноў сустрэцца з Ладзісавым ужо ў сценах гэтай установы, успомніць агульных знаёмых, пагаварыць пра мастацтва. Алег не пакінуў свайго ўлюбёнага занятку. Мне давялося пабываць на яго выстаўках і ў Полацку, і ў сталіцы.

«У пошуках асабістай прасторы» — так вызначыў Алег Ладзісаў сваю асабістую выстаўку ў Полацку.

Як пісалася ў анатацыі, «Аўтар працуе ў галіне абстрактнага жывапісу. Вобразы Алега Ладзісава — фантазія, абстракцыя, захапленне колерам, асабістая атмасфера і ўзнясенне над звыклай рэчаіснасцю».

Сёння ўжо на абстракцыяністаў не глядзяць у нас, як раней: маўляў, буржуазнае бездухоўнае штукарства. Энцыклапедыя падае гэты тэрмін як «выдаленне», «адцягненне» — беспрадметнае мастацтва, гэта значыць, мастацтва, якое паказвае не навакольны бачны свет, а якое імкнецца непасрэдна выяўляць «духоўныя сутнасці», агульныя паняцці, непаўторны ўнутраны свет аўтара.

Як сведчаць мастацтвазнаўцы, жывапіс Ладзісава дрэнна ўпісываецца ў якія-небудзь рамкі. Яго абстракцыі даюць гледачу прастору для асацыяцый, паэтычных вольнасцяў, гульні ўяўлення. Шмат цікавага робіць Алег Іванавіч і ў родным музеі. Там ён сапраўдны навуковец, арганізатар творчага працэсу. А наша полацкае знаёмства вырасла ў цёплыя шчырыя адносіны. І, сустракаючыся ў музеі ці проста на вуліцы, мы нярэдка згадваем з прыемнасцю і любоўю нашу агульную радзіму — велічны і цудоўны Полацк.

Аб'яднанне, якога не было. Афіцыйна

Хто ўваходзіў у літаратурную багему пачатку 1930-х гадоў

На пачатку 1930-х у краіне віравала літаратурнае жыццё: выходзілі часопісы «Маладняк», «Узвышша» і «Полымя». Існаваў і Дом пісьменніка, а насупраць яго размяшчалася Беларускае дзяржаўнае выдавецтва. Там жа — рэдакцыі часопісаў, газет і бухгалтэрыя, у якой пісьменнікі атрымлівалі ганарары. Пасля ішлі адзначаць падзею ў сталоўку, якая месцілася ў скляпеннях Дома пісьменніка. Там, мусіць, і з'явіўся ТАВІЗ.

Валеры Маракоў у «Шашлычнай» на вуліцы Камсамольскай. Мінск, 1930-я гг. Фота з архіва Беларускага інстытута навукі і мастацтва (г. Нью-Ёрк, ЗША).

У межах праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры прапанаваў лекцыю, якую падрыхтаваў даследчык, літаратуразнаўца, супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Віктар Жыбуль. Першае, што адзначыў дакладчык, гэта тое, што ў энцыклапедыях няма інфармацыі пра Таварыства аматараў выпіць і закусіць (менавіта так расшыфроўваецца абрэвіятура), бо суполка была нефармальная, стварылася як багемны супраціў беларускаму літаратурнаму афіцыёзу. Існавала нават версія, што нічога насамрэч і не было, усё — містыфікацыя. Але ў часопісе «Роднае слова» за 1997 год выйшаў артыкул Лявона Юрэвіча пад назвай «ТАВІЗаўцы: пра лёсы ўдзельнікаў аднаго літаратурнага аб'яднання». Сутнасць яго ў тым, што ў архіве паэта-эмігранта Юркі Віцьбіча даследчык натрапіў на яго лісты да крытыка Антона Адамовіча з расповедам пра суполку. Праўда, у існаванне ТАВІЗу паэт не паверыў, нягледзячы на тое, што сам і знайшоў пра яго інфармацыю. Бо падобных звестак нідзе больш не сустракалася...

Але пошукі не спыняліся. Штосьці адкрывалася і выпадкова. Так, сведчаннем існавання ТАВІЗу служыць дакумент той эпохі: нататка, надрукаваная ў «Савецкай Беларусі» за 1 лютага 1931 года за подпісам Б.Б. Падхоплены хваляй барацьбы з «багемшчынай» і «нацдэмаўшчынай», у загалоўку аўтар сцвярджаў: «Арганізатарам багемы не месца ў радах пралетарскіх пісьменнікаў!» Далей паведамлялася, што «...група багемствуючых пісьменнікаў знайшла сабе прытулак у Доме пісьменнікаў і адчувала сябе там як дома… Усе прыгоды гэтай групы набываюць арганізаваны ўжо характар і вырастаюць у групу пад назвай ТАВІЗ… Найбольш сумным з'яўляецца тое, што на чале ТАВІЗу знаходзяцца такія пісьменнікі, як Звонак, Хадыка і Маракоў»...

Як пісаў ва ўспамінах пра суполку Юрка Віцьбіч (ён і сам быў яе ўдзельнікам), ТАВІЗаўцамі з'яўляліся Міхась Багун, Тодар Кляшторны, Сяргей Дарожны і шмат іншых. Яны ўяўлялі з сябе дэманстрацыйную ў дачыненні да Саюза пісьменнікаў БССР забароненую багему.

Віцьбіч падкрэсліваў, што не ў залах і кабінетах Дома пісьменнікаў, а ў шынках па Савецкай і Камсамольскай сталічных вуліцах абмяркоўвалі таленавітыя ТАВІЗаўцы сваю творчасць — пасяджэнні зазвычай праводзіліся ў кавярнях, піўнушцы, шашлычнай, у гасцініцы альбо на кватэры. Нават былі сустрэчы на закрытым ад цікаўных вачэй балконе рэстарана «Еўропа».

У самой назве ТАВІЗ адчуваўся і эпатаж, і пародыя на тагачасныя афіцыёзныя ўстановы, што імкнуліся прыдумаць нейкую абрэвіятуру. Было і імкненне схаваць крамольную літаратурную дзейнасць, бо на сходах чыталіся вершы, не прызначаныя для друку, а тыя, што пісаліся для сябе, — кожны ў іх пачуваўся сам сабой.

У самой назве ТАВІЗ адчуваўся і эпатаж, і пародыя на тагачасныя афіцыёзныя ўстановы, што імкнуліся прыдумаць нейкую абрэвіятуру. Было і імкненне схаваць крамольную літаратурную дзейнасць, бо на сходах чыталіся вершы, не прызначаныя для друку, а тыя, што пісаліся для сябе, — кожны ў іх пачуваўся сам сабой. Пісьменнікі і камуфлявалі сваю суполку пад зборышча алкаголікаў — так было прасцей і бяспечней. Калі паэта застуквалі за напісаннем контррэвалюцыйных вершаў, справа магла скончыцца значна больш трагічна, чым калі яго затрымлівалі ў нецвярозым выглядзе. Тады, у 1930-х, пракацілася хваля рэпрэсій па справе Саюза вызвалення… З іншага боку, чым бліжэй было да сярэдзіны 1930-х, тым больш у грамадстве адчувалася напружанне, у друку часта з'яўляліся артыкулы адыёзных крытыкаў з палітычнымі абвінавачваннямі. Таму нядзіўна, што ў паэтаў былі трагічныя прадчуванні — яны імкнуліся ўхапіць апошнюю магчымасць зведаць радасць у выглядзе сяброўскага застолля перад тым, што іх чакала наперадзе. Міхася Багуна, аднаго з яркіх лідараў, і называе Юрка Віцьбіч вынаходнікам назвы суполкі. Пісьменнікі тады мусілі весці падвойнае жыццё. Так, яны друкавалі ў газетах і часопісах вершы, у якіх услаўлялі курс партыі і тагачасных павадыроў. Аднак Віцьбіч згадвае, што паэты тады мелі ў запасніках вершы на смерць партыйных правадыроў, і калі гэтая падзея здаралася, упісвалі прозвішчы ў гатовы верш і беглі ў рэдакцыю.

Падвойнае жыццё ТАВІЗаўцаў выяўлялася яшчэ і ў тым, што яны займаліся калектыўнай творчасцю для дзяцей. У часопісах за 1934 — 1935 гады можна пабачыць вершы, якія пісалі разам Тодар Кляшторны і Алесь Дудар. Трохі пазней да іх далучыўся і Валер Маракоў. Уважлівае чытанне твораў для дзяцей наводзіць на роздум: а хто маецца на ўвазе ў галоўных вобразах? Магчыма, творцы адлюстравалі ўласныя перажыванні, трывожныя прадчуванні. Тыя ж трывожныя вобразы сустракаліся і ў дарослай творчасці ТАВІЗаўца Тодара Кляшторнага таксама.

Сярод успамінаў Юркі Віцьбіча ёсць згадкі аб тым часе, калі прымалася сталінская Канстытуцыя: паўсюль у дзяржаўных установах ішло актыўнае абмеркаванне падзеі, а чыноўнікі ад літаратуры адзначалі яе гарачымі прамовамі. Тады ж у сталоўцы Дома пісьменніка за куфлем горкага піва сядзелі Алесь Дудар, Валер Маракоў і Уладзімір Хадыка. Да іх падышоў Купала і зачытаў урывак паэмы «Над ракою Арэсай», прысвечанай калектывізацыі і індустрыялізацыі. І спытаў: «Ну як вам, хлопцы?» Тыя ў адказ прамаўчалі. Купала зразумеў іх маўчанне, сказаў: «Так, і я з вамі згодны, а вось ім там спадабалася…» Пасля Купала зачытаў на памяць верш Алеся Дудара — той быў настолькі крануты, што заплакаў.

У Віцьбіча ёсць дзіўны сказ: ТАВІЗ праіснаваў да самай вайны. Але такога быць не магло, упэўнены Віктар Жыбуль, бо ў 1936 годзе многія ўдзельнікі таварыства былі арыштаваныя, расстраляныя альбо адпраўленыя ў лагер. Толькі Эдуард Самуйлёнак памёр у 1939 годзе не ў турме, — ад сухотаў. Дзеячоў, з каго мог складацца ТАВІЗ, ужо не было, перакананы даследчык.

Тым не менш хто ведае, што яшчэ хаваюць архівы?..

Яна БУДОВІЧ

Рытмамузыка

Беларусь мае сваю санетную дыядэму

Яе аўтаркай прадказальна стала Соф'я Шах. Адразу ж нагадаю, што пад словам «дыядэма» мы звычайна разумеем жаночае ўпрыгожванне з каштоўных камянёў у выглядзе кароны. А санетная дыядэма — гэта 15 узаемазвязаных вянкоў вянкоў санетаў, або 225 вянкоў. Няцяжка падлічыць, што для напісання яе спатрэбілася 3375 таксама вельмі ўзаемапераймальных санетаў. Аналагаў нават у сусветнай паэзіі адшукаць амаль немагчыма.

Інтэрнэт называе, праўда, прозвішча рускага паэта Сяргея Мінтаірава, але паглядзець або пачытаць яго твор пакуль нідзе немагчыма. Напісаць санетную дыядэму ў свой час спрабаваў вядомы расійскі паэт Ілья Сяльвінскі. «У 1919 годзе задумаў я стварыць карону карон санетаў — «Георгій Гай», дзе магістралам была б цэлая карона. Такая паэма павінна была б мець 3164 радкі…» Адразу ж перапыню слыннага паэта і заўважу, што ў сапраўднай дыядэме, як я ўжо зазначаў, 3375 узаемазвязаных санетаў, а не радкоў. Відаць, ён меў на ўвазе нешта іншае. Тым не менш паслухаем далейшыя развагі шаноўнага майстра паэтычнага слова. «Я напісаў было некалькі першых санетаў, але своечасова адумаўся…» Даследчыкі пайшлі далей гэтых разваг і вызначаюць, што калі падступіцца да канструкцыі больш складанай, то ўбачым кірунак ускладнення ў бок вянка вянкоў вянкоў санетаў — ён жа вянок у кубе. Іншы раз гэта называюць пірамідай санетаў ці дыядэмай… Стварэнне вянка вянкоў вянкоў санетаў, на думку аўтарытэтных навукоўцаў, уяўляецца ім практычна неажыццяўляльным. Маўляў, гэта яшчэ адно пацвярджэнне абмежаванасці чалавечага духу, не здольнага справіцца з задачай не тое што бясконцага, а хаця б трэцяга ўзроўню складанасці.

Вядомы літаратуразнаўца Віктар Шклоўскі нават выказваў сумненне ў тым, што задача можа быць выканана без рызыкі для псіхікі аўтара. «Аднак такім вершаваным цыклам, — зазначае ён, — нельга адмаўляць у наяўнасці зачаравальнай прыгажосці, якая настойліва патрабуе поўнага паглыблення, маючы на ўвазе, што няма ніякіх абяцанняў адносна вяртання ў рэальны свет…»

Вось такія перасцярогі і жарсці падпільноўвалі Соф'ю Шах, калі яна адважылася зрабіць тое, чаго яшчэ няма не толькі ў беларускім прыгожым пісьменстве. І задумвалася, і ажыццяўлялася гэтая паэтычная эпапея на маіх вачах з асцерагальна натхняльным назіраннем. Дарэчы, і сам, што называецца, крыху адчуў класічны смак гэтага элітнага жанру паэзіі. Выдаў зборнік санетаў «Куда б ни шёл — иду к своей судьбе» (2002), зборнікі вянкоў санетаў «Но даже умираем, чтобы жить» (1999) і «Неизъяснимое» (2015), дзве кнігі вянкоў вянкоў санетаў: «Земля простит, но не прощает небо»(2001), «Ещё за далью и за высотой» (2015). Выдаў кнігу трыялетаў, у якой ёсць двайныя трыялеты і нават некалькі вянкоў трыялетаў, хаця да гэтага часу не ведаю, ці існуе такі жанр паэзіі… Але ўсё тое, што мы зрабілі разам, не ідзе ні ў якое параўнанне з тым, на што асмелілася Соф'я Шах.

Невыпадкова ў самым пачатку гэтых радкоў я зазначыў, што аўтаркай санетнай дыядэмы прадказальна стала менавіта яна. Кожны больш-менш дасведчаны чытач сучаснай беларускай паэзіі не мог не заўважыць яе апантаную вернасць класічнаму санетнаму жанру. Яшчэ ў 1999 годзе, калі пісаў прадмову да кніжнага выдання яе першага вянка вянкоў санетаў «Адухаўленне», зазначыў, што санет — яе стыхія. І зараз магу пацвердзіць гэтыя словы тым, што на рахунку Соф'і Шах 13 вянкоў вянкоў санетаў (з іх 5 адрасаваны дзецям), 227 вянкоў санетаў (у тым ліку 26 для дзяцей). І вось дыядэма!

Упэўнены, што санетных твораў у яе больш, чым на сёння ва ўсёй беларускай паэзіі. Зрэшты, ці ведаем мы ўсе патаемныя скарбы нашага прыгожага пісьменства?! А ў той час, калі выходзіў першы вянок вянкоў «Адухаўленне», паэтка па розных, незалежных ад яе абставінах, змагла выдаць толькі танюсенькую кніжачку «І не пакіне спадзяванне», што пабачыла свет у дадатку да часопіса «Маладосць» у 1989 годзе з блаславення Яўгеніі Янішчыц. Потым з'явіўся поўнаважкі паэтычны зборнік «Пад высокай лагодай нябёс» («Мастацкая літаратура», 1995).

Крытык і літаратуразнаўца Уладзімір Гніламёдаў у аглядзе сучаснай паэзіі пісаў: «Не так даўно я адзначыў для сябе новае імя — Соф'я Шах. Голас нягучны, але вельмі праўдзівы. На маю думку, гэта сапраўдная паэзія і па-сапраўднаму грамадзянская, маральна змястоўная... Тут ёсць жывы чалавечы характар, ёсць герой, з асобай якога паэтэса не баіцца ідэнтыфікаваць сябе. Вобразнасць, што вынікае са светапогляду паэтэсы, з яе светаўспрымання, выбудаваная на народнай аснове».

Так, вершы Соф'і Шах крытыка заўважыла і па-добраму прывітала. А вось стаўленне да яе вянкоў санетаў было і застаецца крыху насцярожаным. Праўда, некаторыя з іх надрукаваныя ў «ЛіМе», «Полымі», «Маладосці», ды ў маім перакладзе ў «Нёмане». Але... І гэтаму «але» ўжо не адно стагоддзе. Справа тут не ў самой Соф'і Шах, а ў санеце, якога на працягу амаль васьмі стагоддзяў то сусветна ўхвалялі, то спрабавалі пазбавіць права на паэтычнае жыццё. «Поэму в сотни строк затмит сонет прекрасный», — упэўнена абвяшчаў заканадаўца класіцызму Нікала Буало. А рамантык Байран лічыў санет «педантычным і сумным». Яшчэ ў 1332 годзе падуанскі юрыст Антоніа дэ Тэмпа ў паэтычным трактаце вызначыў асноўныя кананічныя правілы напісання санета. Потым яны неаднойчы ўдакладняліся, рабіліся больш патрабавальнымі. Вось некаторыя з іх: 14 радкоў, а гэта два чатырохрадкоўі (катрэны) і два трохрадкоўі (тэрцэты). У катрэна звычайна дзве рыфмы, якія паўтараюцца чатыры разы, а ў тэрцэтах — або тры паўтараюцца двойчы, або дзве рыфмы — тройчы. Устойлівая сістэма рыфмоўкі ў класічным санеце: перакрыжаваная ці (лепш) апаясная рыфма ў катрэнах і больш разнастайная — у тэрцэтах. Устойлівы памер: у рускай, нямецкай, галандскай, скандынаўскай паэзіі, напрыклад, пяцістопны (або шасцістопны) ямб. Дадайце сюды яшчэ патрабаванне, каб кожная з чатырох частак санета валодала ўнутранай сінтаксічнай завершанасцю, цэласнасцю, каб рыфмы былі гучнымі пры абавязковым чаргаванні мужчынскіх і жаночых, а адно і тое ж слова не паўтаралася, калі гэтае паўтарэнне не дыктуецца свядома аўтарам, — і вы зразумееце таго ж Буало, які сцвярджаў, што Апалон вынайшаў санетную форму ў час, калі сердаваў на вершатворцаў.

Ведаў бы італьянец Якопа (Джакома) дэ Ленціні, — а гэта ён напісаў першы вядомы нам санет, — які прыклад падае паэтам усіх наступных пакаленняў! У сваім славутым санеце аб санеце Шарль Сент-Бёў назваў многіх паэтаў, хто аддаў шчодрую даніну гэтаму нялёгкаму паэтычнаму жанру: Шэкспір, Пятрарка, Тас, Камоэнс, Дант, Спенсер, Мільтан, Рансар... Магу дадаць і Вордсварта, і Кітса… Ды ці толькі іх! У рускай паэзіі аўтарамі класічных санетаў з'яўляюцца паэты К. Случэўскі, І. Аненскі, К. Фофанаў, К. Бальмант, Ф. Салагуб, В. Брусаў, М. Валошын, А. Блок, М. Гумілёў, В. Мандэльштам, В. Хлебнікаў, І. Севяранін, В. Хадасевіч... Першыя беларускія санеты напісаў Я. Купала. Сапраўднымі шэдэўрамі паэзіі сталі санеты М. Багдановіча. Узбагацілі імі беларускую літаратуру П. Трус, У. Жылка, М. Танк, С. Грахоўскі, Н. Гілевіч, Р. Барадулін, Я. Сіпакоў, Зм. Марозаў, А. Сербантовіч, А. Звонак, Хв. Жычка...

Што ж датычыцца Соф'і Шах, то яна не абмяжоўваецца напісаннем санетаў, а ператварае іх у вянкі, або ў вянкі вянкоў. Санетаў, якія б існавалі самі па сабе, у яе, бадай, увогуле няма. Дзіўная асаблівасць творчасці. Яна патрабуе глыбокага, вольнага паэтычнага дыхання і бездакорнага майстэрства. Кожны вянок чытаецца як санетная паэма, а кожны вянок вянкоў — як санетная аповесць. Але ж кананічныя патрабаванні вельмі строгія: у вянку новы санет павінен пачынацца апошнім радком папярэдняга, а апошні — 15-ты — складаецца з першых радкоў усіх папярэдніх санетаў. Тое ж самае і ў вянку вянкоў, толькі ў ім ужо апошні, 15-ты вянок, складаецца з першых радкоў санетаў усіх папярэдніх вянкоў.

Соф'я Шах смела эксперыментуе. Даказаўшы, што класічныя вянкі санетаў — яе родная стыхія, паэтка мае на гэта права. Якіх толькі вянкоў санетаў у яе няма! Змешаныя: шэкспіраўскія катрэны і класічныя тэрцэты; безгаловыя — без аднаго катрэна; усечаныя — з адным тэрцэтам; безгалова-ўсечаныя; перавернутыя — катрэны і тэрцэты памяняліся месцамі; зблытаныя — катрэны чаргуюцца з тэрцэтамі; хвастатыя — з трыма тэрцэтамі… А яшчэ вянкі, у якіх санеты складаюцца з двух пяцірадкоўяў і аднаго чатырохрадкоўя. Пры гэтым паэтка дазваляе сабе карыстацца не толькі традыцыйным 5 альбо 6-цістопным ямбам, але і іншымі вершаванымі памерамі. Але ўсё гэта было выключэннем. Ад маладой, вясёлай сілы таленту, ад жадання яшчэ раз адчуць паслухмяную лагоднасць роднай мовы, якою можна выказаць усё. Аднак звычайна яна стараецца не парушаць класічных канонаў.

І вось на сустрэчу з чытачом неўзабаве павінен выйсці першы ў беларускай літаратуры вянок вянкоў вянкоў санетаў Соф'і Шах «Дыядэмная споведзь», якая пачынаецца і заканчваецца словамі: «Жылі калісьці продкі на зямлі…» Адкуль такое прасторавае натхненне? Ну, вядома ж, ад родных Азарыч, ад поля за імі, ад рачулкі Вішы, ад мілай вулачкі Піянерскай, ад незабыўнай хаткі... Ад маці. І ад уласнага сумлення, якое адразу ж падказвае адзіна магчымую даверлівую інтанацыю. Апорна-сэнсавыя словы: продкі, бацькі, маленства, школьныя гады, студэнцтва, выкладчыцкая праца ў вёсцы, нараджэнне дачкі, вяртанне ў Азарычы, жыццёвая няўцямнасць, прыезд у Светлагорск, лёсавызначальная сустрэча з будучым мужам, вучоба дачкі ў Пецярбургу, паэзія, жывапіс, раздвоены жыццёвы іспыт… І ўсё гэта нібыта шматслаёвы жывапіс, які шукае сваё адзіна магчымае каляровае ўвасабленне, знаходзіць менавіта тую моўную прасторавую шматасацыятыўнасць, без якой няма і не можа быць паэзіі. Стагоддзі збліжаюцца і аддаляюцца, прасякнутыя рэальнай канкрэтыкай лёсаў, падзей, светаадчуванняў, разваг і паэтычнай дасведчанасці. Толькі так асабістае перастае быць уласным і набывае мастацкае абагуленае ўвасабленне. Жанравая неабходнасць паўтарэння радкоў надае не толькі рытмамузыку, але і робіцца сэнсавым камертонам, які грунтуе ўсё тое, што нібыта можа знікнуць у бясконцых лабірынтах падсвядомасці.

Асабіста мне раней не даводзілася ні чытаць, ні чуць пра вянок вянкоў вянкоў санетаў. Не ведала гэтага і Соф'я Шах. Напісана дыядэма пяцістопным «шэкспіраўскім санетам», што дазваляе рабіць больш разнастайнай рыфмоўку. Нагадаю таксама, што гэта тры чатырохрадкоўі і адно заключнае двухрадкоўе. А змест? Прасцей за ўсё сказаць, што ў ім уся жыццёвая аснова паэткі ў асяроддзі спрадвечнага часу. Яна пацвердзіла не толькі сілу свайго таленту, але і магчымасці мовы, у якой сапраўды дыядэмна пачувае сябе роднае беларускае слова.

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ

З атласам замкаў — па Беларусі

У выдавецтве «Мастацкая літаратура» пабачыў свет «Дзіцячы атлас Беларусі. Замкі, крэпасці, бажніцы». З першага погляду кнігу можна вызначыць як добра ілюстраваную дзіцячую энцыклапедыю помнікаў беларускага дойлідства. Але тэкст матэрыялу мяжуе з мастацкім пераказам, што розніць кнігу ад падобных выданняў, і ў гэтым, безумоўна, заслуга аўтара. Аўтар і ўкладальнік кнігі Яраш Малішэўскі — прафесійны гісторык. А яшчэ — гід, падарожнік, вандроўнік, які сам наведаў большасць гэтых мясцін, і апавядае пра тое, што бачыў на ўласныя вочы. А часам ведае і тое, пра што вы не даведаецеся ні з аднаго даведніка. Чаго толькі вартыя ягоныя архіўныя даследаванні дакументаў часоў Вялікага Княства Літоўскага. На старонках пажоўклых судовых кніг далёкіх часоў можна знайсці ўнікальную інфармацыю — пра помнікі таксама.

Беларускае дойлідства развівалася ў рэчышчы еўрапейскай архітэктуры. Замкі, крэпасці і бажніцы, якіх так багата на нашых землях, — гэта творы, якія сведчаць пра нашу краіну, яе гісторыю і культуру. Адзін помнік — праца знанага дойліда з далёкай заходнееўрапейскай краіны, іншы — шэдэўр беларускага архітэктара…

Гісторыі, знітаваныя з помнікамі беларускага дойлідства, Яраш можа апавядаць гадзінамі — захапляльна і змястоўна. І пра гісторыю саміх мясцін, і пра падзеі, што адбываліся падчас узвядзення ды існавання таго ці іншага помніка. Бо кожны помнік дэманструе свой час. А калі размова пра замак ці палац, то аўтар можа распавесці і пра ягоных уладароў, часцяком — знакамітых дзяржаўных дзеячаў.

У кнізе ў кароткай форме пададзены асноўныя звесткі пра раскошныя беларускія замкі, магутныя крэпасці-фартэцыі, вытанчаныя касцёлы, цэрквы, мячэці і сінагогі, як захаваныя, так і страчаныя, але адноўленыя ў малюнках. Багатае мастацкае аздабленне кнігі заслугоўвае асаблівай увагі. Матэрыял пададзены ўпарадкавана, па абласцях — для лягчэйшай арыентацыі, што вельмі зручна для аматараў вандровак. Кніга будзе цікавая не толькі юнаму чытачу — яна разлічаная на ўсіх, хто цікавіцца беларускай гісторыяй і прагне даведацца болей пра перліны нашай архітэктуры, а пагатоў і наведаць іх. Аўтар ў прадмове адзначае: «Нашыя помнікі — адзін з тых падмуркаў, на якіх будуецца ўсведамленне сябе як чалавека, што ведае свае карані. І яны даюць моц — жыць і ствараць. У кожным з іх свая магія».

Алег ГРУШЭЦКІ

Вершаваны слоўнік Кажураў

У кнізе «Рэха мінулых дзён» (Мінск, Беларуская асацыяцыя «Конкурс», 2018) аўтары Віктар і Зоя Кажуры паспрабавалі даць адказы на пытанні: хто такія беларусы? дзе нашы карані? хто стварыў нашу гісторыю? што засталося беларусам ад продкаў? Што берагчы, каб пакінуць нашчадкам? Аўтары ў нейкім сэнсе сталі экскурсаводамі па часе, дазволіўшы чытачу атрымаць у цікавай форме веды пра народ і сваю краіну падчас вандроўкі.

Выданне мае форму паэтычнага слоўніка. 248 паняццяў, сабраных у ім, даюць поўнае ўяўленне пра быт, звычаі, абрады мінулага, распавядаюць пра вядомых асоб мінуўшчыны. Ёсць звесткі пра асобныя вёскі і гарады Беларусі, якія адыгралі значную ролю ў нашай гісторыі, напрыклад Полацк, Навагрудак, Нясвіж, Тураў. Такім чынам, умоўна кнігу можна назваць паэтычна-гістарычнай энцыклапедыяй Беларусі: дакладныя факты і звесткі маюць свой працяг у вершаваных замалёўках. Гэты фармат дазваляе лепш запомніць тую ці іншую інфармацыю, што важна асабліва для школьнікаў. Кніга будзе карысная на занятках па беларускай мове і літаратуры, гісторыі, грамадазнаўстве і іншых. З-за такой тэматычнай разнастайнасці тэрмінаў хацелася б пабачыць напрыканцы кнігі і змест, што дазволіла б лепш арыентавацца. Але, магчыма, гэта не прадугледжвае памер і фармат выдання (248 слоў на 128 старонках).

Укладальнікі звяртаюць увагу: на працягу аднаго тысячагоддзя слоўнікавы склад мовы змяняецца прыблізна на 80 %. З-за знікнення нейкіх рэчаў і з'яў і замены некаторых назваў іншымі мова пастаянна трансфармуецца. Але ж і гістарызмы, і архаізмы, якія да нашых дзён выкарыстоўваюцца для апісання пэўнай эпохі, часам застаючыся незразумелымі сучасніку. Таму, акрамя слоў, што будуць знаёмыя кожнаму школьніку, у кнізе можна знайсці і тыя, што сустракаюцца даволі рэдка — *коварат, лаўнік, лукно, павабенне, падарожчына, прыдомак, шабета, шарваркі*. Тлумачэнне кожнага паняцця і каментарыі да яго абапіраюцца на інфармацыю з энцыклапедычных даведнікаў, сярод якіх «Народная культура Беларусі», «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі», «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» ды іншыя.

Яўгенія ШЫЦЬКА

«Багоўка», дзеткам сяброўка



«Божая кароўка, паляці на неба!» — хто з нас, як і Уладзімір Сіўчыкаў у загалоўным вершы кніжкі, у дзяцінстве не звяртаўся да сімпатычнага, у плямках, жучка, надзвычай карыснага для раслін, хто не радаваўся, калі той, замоўлены, слухаўся і стартаваў з далоні пад аблокі?! Зборнік вершаў «Багоўка» Уладзіміра Сіўчыкава летась пабачыў свет у серыі «Нашым дзеткам», якую пяць гадоў таму адкрыла выдавецтва «Мастацкая літаратура». Гэта невялікая кніжачка, светлая і радасная, разлічаная на самых маленькіх чытачоў і слухачоў, іх бацькоў, бабуль і дзядуль. Прычым адрасаваная ім менавіта беларускім карыстальнікам і спажыўцам. Беларусацэнтрычнасць і этнаграфічнасць — адметныя рысы кніжкі: гераіні Алеся, Хрысціна і Злата, мотальскі кажушок, глыбоцкая згушчонка, дарога са сталічнай Серабранкі.

Гэта кніга для самых маленькіх чытачоў. Над ілюстрацыямі працавала мастачка Анастасія Лісавец. Сабраныя ў кнізе вершы лёгкія і пазітыўныя. Галоўныя героі — дзеці, жывёлы, птушкі, якія выдатна сябруюць і вельмі падобныя адно да аднаго. Клапатлівы кот Цімох разганяе сарок, што перашкаджаюць спаць яго маленькай гаспадыні; дзяўчынка, як і вавёрка, мае ўласную хованку для смачных прыпасаў…

Кніжка адразу выклікае замілаванне, яе хочацца ўзяць у рукі, пагартаць, разгледзець малюнкі, а потым і пачытаць. Немалая заслуга ў тым суаўтаркі У. Сіўчыкава мастачкі Насты Лісавец, і, трэба прызнаць, кніжны дэбют яе вельмі ўдалы. Спрыяюць таму выдатнае паліграфічнае выкананне і дызайн — зручны, амаль што квадратны фармат, шчыльная мелаваная папера, закруглены абрэз кутоў старонак.

Вершаваныя радкі ў кнізе празрыстыя, запамінальныя, а ці не галоўная, скразная тэма — любоў да матулі і ўдзячнасць ёй як самаму дарагому ў свеце чалавеку.

— Маму родную шаную,
І люблю, і паважаю,
І цалую, і мілую,
Бо яна ў мяне такая!
Гэткай добрай, слаўнай мамы
Не купіць ні ў якай краме,
Не знайсці ва ўніверсаме,
Не набыць і ў «Панараме».

Прачытваюцца ў аўтарскіх радках і фальклорныя матывы, традыцыі народных замоў і калыханак. І нездарма, бо моўны код у дзіцяці закладаецца з калыскі:

Нібы замову,
Моц і пяшчоту
Бацькавай мовы
Помні заўсёды.
Нашы абрусы —
Кветкі ды птушкі.
Будзь беларускай
Шчырай, дачушка!

Дзеці заўсёды цікавяцца прыродай, звяртаюць увагу на самых маленькіх істот, таму адкрываюць кнігу вершыкі пра слімака і пра багоўку. «Багоўка» — дасціпная перапрацоўка вядомай рускамоўнай песенькі:

— Божая кароўка,
Паляці на неба —
Там твае сяброўкі
Захацелі хлеба.
Аднясі ім дранік —
Будзе сыты ранак.
Любым сваім дзеткам
Аднясі катлеткі (…)

Аўтар уводзіць у творы беларускія брэнды — і гэта не толькі дранікі. Самая цёплая вопратка — кажушок з Моталя, самы смачны ласунак — глыбоцкая згушчонка… Дзеці вучацца радавацца рэчам, якія ёсць у дасягальным, блізкім свеце, што заўсёды будзе вельмі важна.

Свет дзяцінства на старонках кнігі паўстае гарманічным і радасным, тут пануюць дабрыня і паразуменне. Матуля — самая слаўная, сябры вартыя найлепшых ласункаў, а радзіма — «дзіўная казка», асабліва цудоўным летнім ранкам.

Магчыма, «Багоўка» прывядзе маленькіх чытачоў да іншых кніг Уладзіміра Сіўчыкава — паэта, рэдактара, выдаўца. Для першай сустрэчы з паэзіяй гэта выданне падыходзіць найлепш!

Юлія ШПАКОВА, Раіса ШАСТАК

Найлепшае выратаванне

Кніга Алеся Гібок-Гібкоўскага «Дом каля возера» — зборнік з чатырох казак, у якіх асноўнай рухальнай сілай з'яўляецца магія. Лёгка заўважыць цікаўнасць аўтара не толькі да стварэння фантастычных сюжэтаў, але і да гістарычнага мінулага нашай краіны: ён звяртаецца да часоў татарскіх набегаў, уводзіць у адну з казак постаць князя Віценя. А ў другой ледзь заўважна дадае рэлігійны кантэкст: людзі носяць паганскія імёны, але ходзяць у царкву і моляцца.

Казка, якая дала назву зборніку, — «Дом каля возера» значна адрозніваецца па сюжэце ад іншых. Папершае, яна адзіная, дзе прысутнічае сучаснае рэальнае жыццё і сучасныя людзі, што жывуць у гарадской кватэры. Патэнцыяльныя чытачы — дзеці — змогуць асацыяваць сябе з галоўным героем. У пэўным сэнсе гэта казка пра тое, як веданне гісторыі можа выратаваць жыццё.

Скразной тэмай трох казак (акрамя апошняй) з'яўляецца каханне. У некаторых адразу вылучыць узрост герояў бывае складана. Так, на пачатку адной з гісторый прынцэса апісваецца як любіміца, гарэзніца, якая можа папрасіць у бацькі-караля жывую малпу, а потым незаўважна для чытача падрастае да васямнаццаці гадоў. Аўтар імкнецца раскрыць сусвет сваіх казак, уводзячы шмат персанажаў, але такім чынам сюжэт ускладняецца.

Фабулы ў асноўным класічныя: каханне з першага погляду, подзвігі дзеля кахання, каханне як узнагарода за подзвіг… Галоўныя персанажы выглядаюць ідэалізаванымі: хлопцы — самыя моцныя і разумныя, дзяўчыны — самыя прыгожыя і добрыя. Але для казкі, якая прадстаўляе свет умоўна, гэта натуральна.

Скразной лініяй усіх сюжэтаў побач з каханнем праходзіць таксама тэма адзіноты, самоты. Скрыпач і Паэт — людзі мастацтва — у розных казках па-рознаму пакутуюць праз адзіноту, праз тое, што сапраўдных сяброў у іх ніколі не было. Вырашаюцца гэтыя праблемы па-рознаму, але аснова адказу адна і тая ж — каханне ды сям'я. Дарэчы, тэму сям'і аўтар прадстаўляе ў тэкстах з асаблівай пяшчотай. Яго персанажы, нягледзячы на ўсе перашкоды, жывуць у шчаслівым свеце, бо тут паміж бацькамі і дзецьмі не існуе ніякіх непаразуменняў, канфлікты паспяхова вырашаюцца, кожны знаходзіць чаканае каханне. Ці сапраўды самота — самае страшнае ў жыцці, а каханне здольнае выратаваць ад усяго на свеце? Кожны мае свой адказ. Але ў адным з аўтарам не паспрачаешся: чалавечыя адносіны — важная частка жыцця і кожны марыць, каб былі яны ідэальныя.

Дар'я СМІРНОВА

Вандроўкі ад Пятра Васючэнкі

Па Млечным Шляху на пыласосе

Куды толькі не закіне аўтара творчая фантазія. Чаго ён толькі не прыдумае. Зрэшты, як і яго маленькія чытачы. Праз старонкі кнігі Пятра Васючэнкі (Жаласлівая каралеўна: казкі. Мінск, Мастацкая літаратура, 2018) мы вандруем у свет дзівосаў. Але дзівосаў розных, і ў кожным з іх — свая адметнасць.

Недзе жывуць людзі, якія зусім не ўмеюць плакаць ці смяяцца. Заўсёды застаюцца халоднымі, сур'ёзнымі і размаўляюць толькі пра грошы. Недзе на дрэвах растуць кілбасы ды булкі, а чароўныя белыя штаны валодаюць магічнай здольнасцю выклікаць дождж. А недзе можна смела вандраваць аж да Млечнага Шляху, варта толькі… узняць на гарышча пыласос. Тут мы сустрэнемся з добрымі сябрамі панамі Кубліцкім і Заблоцкім і пазнаёмімся з новымі героямі, сапраўднымі і віртуальнымі.

На старонках казак, што ўвайшлі ў кнігу «Жаласлівая каралеўна», Пятро Васючэнка дае нам магчымасць пазнаёміцца не толькі са светам уяўным, чароўным, прыдуманым, але і здзейсніць вандроўку ў нашу міфалагічную мінуўшчыну.

Так, у казцы «Валадар казы» (ужо ў назве бачыце адсылку да знакамітай трылогіі англійскага філолага Толкіна «Валадар пярсцёркаў»?) аўтар прапануе ўласную інтэрпрэтацыю міфа пра Каляды, Вялікдзень і ролю сімвалічнай свойскай жывёлы казы ў змене пор года. Каза Дзераза і яе гаспадар Таптуха (дарэчы, трэці з сыноў гаспадара Багунніка, паводле традыцый, самы няўклюдны і на першы погляд найменш таленавіты) становяцца пэўнага кшталту прарокамі ў сваёй мясцовасці.

Таптуха, чытаючы карту зорнага неба, стварыўшы пясочны гадзіннік, можа прадбачыць дождж і мароз, надыход зімы і лета, «смерць» і новае нараджэнне Сонца. А яго каза сваімі танцамі і чароўнымі рагамі можа прымушаць сонца ўздымацца ад сну. Зрэшты, паводле законаў казкі, такія яскравыя героі мусяць мець і антаганістаў. У дадзеным выпадку — злога варажбіта Сапуна і зайздрослівую братавую Таптухі. Усялякімі намаганнямі яны спрабуюць забіць Дзеразу, а яе гаспадара — пусціць з торбай па свеце. Як лічыце, хто пераможа? І тут, адпаведна законам казкі, усё прадказальна. Але гэта яе станоўчая рыса.

Час не стаіць на месцы, таму і казкі, пры ўсёй старажытнасці жанру, мусяць адпавядаць эпосе і з'явам, ёй характэрным. Таму Пятро Васючэнка знаёміць нас са сваёй сучаснай гераіняй Лілі. Гэта віртуальная дзяўчынка, якая жыве ў камп'ютарным свеце і час ад часу завітвае ў госці да лірычнага героя, каб пагаманіць пра свет людзей. У сваіх «Казках для Лілі», якія, паводле жанру, больш падобныя да прытчаў, герой расказвае алегарычныя гісторыі пра смеласць і шчырасць, пра досціп і мужнасць, пра магчымасць нават вярнуцца з іншасвету, каб абараніць каханых. Як і любую прытчу, гэтыя аповеды няварта ўспрымаць літаральна, але паразважаць над іх сімвалічным зместам — абавязкова.

Варта таксама звярнуць увагу і на яскравыя ілюстрацыі да казак, што стварыў Міхаіл Дайлідаў. Гэта не проста «пераказ» сюжэта на мове малюнка, але асобная гісторыя, якая толькі некаторымі кропкамі судакранаецца з аўтарскім аповедам. Мастацкія работы, што аздобілі кнігу, крыху змрочныя, крыху загрувашчаныя дэталямі, але разам з тым дакладна прамаляваныя, валодаюць уласным характарам і расказваюць сваю гісторыю. Зрэшты, так і павінна быць.

Марына ВЕСЯЛУХА

На Зорным Ровары па сэнс жыцця

Раман-казку Пятра Васючэнкі «Дзівоснае лета паноў Кубліцкага ды Заблоцкага» (Мінск, «Кнігазбор», 2018) варта чытаць, а пасля і перачытваць не адзін раз, не спяшаючыся, смакуючы кожнае слова — настолькі жывая і сакавітая мова расповедаў, што з першых старонак напаўняе душу адчуваннем высокай паэзіі (хаця твор празаічны), пазітыўнай энергетыкай, прымушае яе радасна пульсаваць у прадчуванні чагосьці яшчэ больш цікавага наперадзе... Гэта твор пра нашу рэчаіснасць, хаця і напісаны ў стылі фэнтэзі з дамешкам сюррэалізму на мяжы з «хорарам» (жахамі) на айчынным фальклорным матэрыяле. А трапны і дасціпны гумар (стылізаваны пад найлепшы ўзор народнага — тонкі, скіраваны на філасофскае асэнсаванне жыцця, а не як у вульгарных анекдотах), якім насычаны твор, ператварае чытанне ў найвялікшае свята!

Галоўныя героі казкі — збяднелыя шляхціцы паны Кубліцкі ды Заблоцкі, ужо знаёмыя чытачам па папярэдніх казачных аповесцях. Жывуць яны ў адной сядзібе, вядуць сумесную гаспадарку: вырошчваюць рэпу, з якой гатуюць усе стравы і нават вырабляюць віно, часам спрачаюцца, сварацца дый зноў заміраюцца. І жылі б сабе й надалей, прыпяваючы, але ж... Ёсць у чалавечай істоце нешта такое, што заўжды падштурхоўвае на прыгоды, прымушае кінуць звыклае ды зрабіць крок у невядомае, бударажыць душу, падкідвае розныя ідэі ды пытанні, на якія абавязкова патрабуецца адшукаць адказы, чаго б гэта ні каштавала, хоць і без усялякага практычнага сэнсу... Вось і паны не змаглі супрацьстаяць гэтаму «нешта» дый выправіліся туды, дзе жыве Той, хто казаў, куды Макар цялят не ганяў, дзе неба з зямлёй сыходзіцца ды бабы на небе бялізну сушаць... Каб высветліць, у чым ёсць ісціна...

Суправаджаюць паноў у іх прыгодах розныя каларытныя істоты: Вірнік, які жыве ў віры на рэчцы Парэчцы, забруджанай хімікатамі ад прамысловай дзейнасці, Зорны Ровар, які быццам усяго толькі сродак перасоўвання, але потым высвятляецца, што і ён мае душу (ці не адгалосак гэта старажытных уяўленняў пра тое, што душа ўласцівая любой рэчы), мясцовы прарок Піліп з канапель, прадстаўнік так званай жоўтай прэсы спадар Жаўтуха. Незадоўга да фіналу на дне калодзежа паны знаходзяць тое, што шукалі, але гэта абарочваецца іх смерцю (ці не алюзія гэта на папулярны колькі гадоў таму фільм жахаў «Званок», дзе з дна калодзежа з'яўляецца страхалюдная дзяўчынка, ад якой няма выратавання)...

Але ж ці можа казка мець трагічны фінал? Альбо падпарадкоўваючыся канонам жанру, альбо пашкадаваўшы чытача, які да гэтага моманту паспеў палюбіць галоўных герояў як родных, альбо каб мець пра каго пісаць наступны раман, — аўтар ператварае і гэта выпрабаванне ў прыгоду...

Праўда, пытанне так і застаецца адкрытым: «...Не трэба мець добрых глуздоў, каб казаць, што кожны павінен быць на сваім месцы, там, дзе яму лепей... А як зрабіць так, каб кожнаму было лепей? Вось тут і самая загваздка, пане Зорны Ровар...» Але ж місія пісьменніка не палягае ў тым, каб даваць гатовыя рэцэпты. Хіба натхняць на пошукі. Тым больш, што ўніверсальнага рэцэпту і не існуе...

Дарэчы, па аснове твора мог бы атрымацца выдатны прыгодніцка-містычны трылер — настолькі маляўніча апісаны ўсе сцэны, да таго ж шмат карцін менавіта ў руху, у дзеянні, што і трэба для адпаведных сцэнарыяў.

Узрост чытачоў, якім адрасаваная казка, пазначаны як 12+. Але без сумнення выданне будзе цікавае і дарослым.

Яна БУДОВІЧ

Разведчыкі, касмічныя прыхадні ды іншыя прыгоды...

Сучасная беларуская проза для дзяцей імкнецца па магчымасці задаволіць запатрабаванні кніжнага рынку. Аднак толькі па магчымасці, калі шчыра, абмежаванай, нягледзячы на тое, што з'яўляюцца творы адносна новыя для беларускай літаратуры паводле формы і зместу (комікс, фэнтэзі, навуковая фантастыка ды іншыя). Адначасова з тым беларускія пісьменнікі імкнуцца захаваць традыцыі класічных узораў славеснага мастацтва — як стылявыя, так і духоўныя. І ў гэтым, думаецца, памылка. Прывязаныя да нядаўняга мінулага, як вязні да сваіх ланцугоў з тым, аднак, адрозненнем, што ланцугі добраахвотныя, аўтары не развіваюцца. Быццам і не заўважаюць сусветнай эвалюцыі літаратуры для і пра дзяцей і падлеткаў.

Раней ратавала серыя «Бібліятэкі прыгод і фантастыкі», заснаваная выдавецтвам «Мастацкая літаратура» ў 1982 годзе. І ў многім дзякуючы ёй не толькі падлеткі, але й дарослыя з захапленнем чыталі лепшыя творы прыгодніцкага жанру. Потым серыя знікла. А цяпер зноў адноўлена кнігай аповесцяў «Мой сябар Дон Кіхот» Аляксея Якімовіча, які ў свой час быў яе пастаянным аўтарам.

Кніга адкрываецца аднайменнай аповесцю, напісанай ці не ў савецкія гады пра школьнае вясковае юнацтва галоўнага героя, што, зрэшты, не ёсць дрэнна. Тае бяды, як кажуць. Ды бяда якраз не спіць у шапку. Спроба асучасніць твор, замяніўшы школьную пяцібальную сістэ-му ведаў на дзесяцібальную, толькі зашкодзіла, зрабіла твор непераканаўчым. Такімі ж непераканаўчымі падаюцца і самі героі, і падзеі, апісаныя ў аповесці — толькі з-за спробы асучасніць яе. Пагадзіцеся, барацьба Дон Кіхота з аматарамі цяжкай музыкі пры дапамозе фальклору і батлеечнага тэатра — утапічная, да таго ж слухаюць тую музыку адмоўныя героі на магнітафоне, пра які сённяшнія падлеткі мо і не чулі. Галоўны герой чытае кніжкі пра разведчыкаў і чэкістаў і хоча быць падобным на іх. Добра! Але ж сённяшнія дзеці захапляюцца супергероямі з амерыканскіх коміксаў. Магчыма, аўтар дасюль упэўнены, што ў вёсках з савецкіх часоў нічога не змянілася? Не ўзнікла б ніякіх пытанняў, калі б аповесць пакінулі некранутай, яна вартая ўвагі, бо ўздымае надзённыя праблемы сяброўства, цеплыні і дабрыні, чуласці і смеласці, чалавечай спагадлівасці, узаемавыручкі і мудрасці.

Зусім іншая гісторыя з наступнай аповесцю кнігі, якая называецца «Здраднік» і пераносіць у XVII стагоддзе, у тыя трагічныя часы, калі Рэч Паспалітая паглынула Вялікае Княства Літоўскае. Пад забаронай апынулася ўсё, што было звязана з беларускасцю, і непакорлівасць каралася з адмысловай жорсткасцю. Асабліва шчыравалі езуіты, прыкрываючы сеянне смерці імем Бога, даруючы грахі забойцам на споведзях. Мова беларуская вынішчалася з ужытку, быццам зелле з палеткаў, разам з яе носьбітамі. На прыкладзе сем'яў Станішэўскіх і Краўцоў аўтар адлюстроўвае эпоху і яе гістарычныя рэаліі з майстэрствам мастака-жывапісца, перапляценне і непадзельнае знітаванне лёсаў дарослых і дзяцей, тупую, невытлумачальную нянавісць Вацлава Станішэўскага да Паўлюка Краўца. Нянавісць беларускага шляхціча, які здрадзіў сваёй Радзіме дзеля матэрыяльных выгод і ўлады над іншымі, да пазбаўленага ўсяго, нават шляхецтва, чалавека, якому агідная чужая воля, бо ён мае ўласную, спрадвечную, з роднай мовай, культурай і гісторыяй. Барацьба паміж імі вядзецца крывавая і бязлітасная, ва ўсякім разе з боку Станішэўскага, чыя дачка, між іншым, сябруе з дзецьмі Краўца, чым яшчэ больш нервуе бацьку...

Упэўнены, аповесць актуальная для сённяшняга часу. Карысна было б вывучаць яе ў школах на ўроках беларускай літаратуры, як сацыяльна-значны твор і яскравы прыклад патрыятызму.

Заключная аповесць кнігі «Эльдарада просіць дапамогі», дарэчы, уключаная ў школьную праграму для пазакласнага чытання, мае чыста прыгодніцкі характар. Аўтар ужывае даволі цікавы мастацкі ходпадманку, пачынаючы аповед з падзей, што маюць фантастычную падаплёку, і гэта дае спадзеў юнаму чытачу на сустрэчу з касмічнымі прыхаднямі. На самай справе яны аказваюцца не абарыгенамі галактычнай цывілізацыі, а дэсантам усходняга кантынента, адпраўленым нацыстам (якому ў свой час удалося пазбегнуць пакарання і схавацца ў тропіках) дзеля пошукаў новага пакалення нацыі. Галоўныя героі твора — беларускія шасцікласнікі — вымушаны супрацьстаяць вар'яту. Не сумняюся, што на іх месцы хацеў бы аказацца ледзь не кожны падлетак, бо менавіта ў гэтым узросце карціць сапраўдных подзвігаў і незвычайных падарожжаў. Аповесць не страціла прыцягальнасці і захапляльнасці, пра што сведчыць статыстыка бібліятэк.

Перавыданне твораў пастаяннага аўтара серыі «Бібліятэка прыгод і фантастыкі» Аляксея Якімовіча, як падаецца, рэч добрая, аднак калі мець на ўвазе поспех серыі ды камерцыйны інтарэс, то, на мой погляд, ёсць патрэба ў пошуку іншых аўтараў, якія працуюць у заяўленых жанрах, у іх заахвочванні і анансаванні іх кніг.

Мікола АДАМ

Валеры ЛІПНЕВІЧ

Чаму гэта адно ўвосень...

Чаму гэта адно ўвосень,
калі дажджы змываюць зялёную фарбу,
разумееш,
што лісце выткане з сонца?

Калі штодзённасць,
як лёд на акне,
ад дыхання памяці растае,
расчытваеш слова,
надрапанае на шыбе, —
«шчасце».

Калі гады
ў вялікіх клопатах пра малыя справы
прамінаюць —
усе лепшыя гады! —
чаму гэта адно тады
здагадваешся,
што ўжо ўсё,
што гэта і было тваё жыццё,
тваё жыццё,
жыццё...

Гэта далонь апёк
восеньскі ліст,
выдадзены маленькім накладам
у выдавецтве «Лета».

***

усе гэтыя людзі
ў строгіх гарнітурах
якія так і не пакамячыліся
пры нараджэнні
з акуратнымі фрызурамі
і дазаванымі ўсмешкамі
з гатовымі фразамі
на ўсе выпадкі жыцця
усе гэтыя людзі
выклікалі адчуванне
частак нейкай машыны
што прыцерліся адна да адной
бліскучых і халаджавых
у іх не было чалавечага —
шурпатасці дрэва
і хвалявання вады

Бабуля

Сонечнае святло,
працэджанае скрозь аблокі,
яшчэ фільтруецца белымі фіранкамі.
Добра вачам —
як рыбам у чыстай вадзе.
Бледныя кветкі
на блакітных шпалерах.
Як твае сённяшнія вочы, бабуля,
на тле маладых і забытых.
Бледнае на блакітным,
сучаснае на мінулым.
Рагатае чырвонае сонца,
што заходзіць ранкам і вяртаецца
ўвечары,
усё яшчэ ўчэпіста трымае
спакутаваную планету твайго жыцця.
І не плытчэе малочная рака,
што пачынаецца ля тваіх рук.
Ты вінавата апраўдваешся:
не ведаеш ні казак, ні траваў,
нідзе не была,
нікуды не хадзіла.
Ад васьмі да васьмідзесяці —
адно праца.
Яе магутныя крылы
бясконца праносяць цябе
над бульбянішчам,
гародам і лугам.
Няўжо твая шурпатая далонь
з абламанымі пазногцямі
таксама была далонькай —
дарожкай
скрозь жытняе поле?
І дзяўчынка з блакітнымі вачыма,
белагаловая, як дзьмухавец,
бегла да ракі?
Гады прайшлі, як абозы.
Непагадзь, бездараж, слёзы.
І тысячы дзён за падводамі
басанож ішлі і галодныя.
Ах далонька-дарожанька!
Разбітая палявая дарога,
схопленая марозам.
Штораз сціскаецца сэрца:
ты спускаешся ў склеп па бульбу,
як на той свет.
У самых звычайных
будзённых справах
мы тысячы разоў рэпетуем смерць.
І прызвычайваемся да яе —
як прызвычайваемся да жыцця.
Сонца
вылупілася з воблака, як куранятка.
— Што ж ты свеціш ды не грэеш...
Як гэта яшчэ зіму перачакаць...
Так не хочацца паміраць гэтым
холадам...
І зямля што камень...
Зажурыўшыся,
ты глядзіш на мяне бляклымі,
некалі блакітнымі вачыма.
У іх болей спачування да мяне,
маладога,
чым зайздрасці.
Так альбо іначай,
ты ўжо пражыла сваё жыццё,
а мяне яшчэ чакае
гэтая доўгая праца,
што ўладарна прыгінае да зямлі,
пазбаўляе колеру вочы,
ад якой, не сціхаючы,
баліць сэрца...
Хто цябе ўчасаў так, бабуля?
Так чорным паламаным грэбнем,
асвятляючы,
раку ўчэсвае грэбля.
Без хусткі,
ты стаіш у квітучай грушы,
амаль равесніцы,
і зазіраеш у падвяночак кветкі.
Свята квітнення
і ўрачыстасць згасання
прырода —
ашчадная сялянка —
ладзіць адначасна.
Бабуля,
ты праходзіш садам, які квітнее.
Свецяцца твае вочы
і разгладжваюцца зморшчыны.
Ты пругка ступаеш,
быццам дом поўны гасцей.
А гэта адно вясна
завітала цябе адведаць і вылекаваць...

***

куды ідзе таполя ў траўні?

з гордым маўчаннем

і толькі ў лістоце —
шапаценне крокаў
шапаценне крокаў

калі ўвосень
лісце
ляжа вакол як сляды
ты заўважыш
што яна таксама тупала на месцы

***

халаджавае паколванне зорак
і чорнае
засмоктванне пустэчы

прытуліўся да каханай
і супакоіўся:
ураўнаважаная
прорва неба
прадоннем жанчыны

***

імкліва
ледзь пагойдваючы клубамі
ідзе дзяўчына

у гэтым «ледзь» —
стрыманая моц

так у біцці пульсу —
спакойнасць жыцця

так у дакладных хістаннях ківача —
неадольнасць часу

дзяўчына —
гэта гадзіннік паводле якога
мы прачуваем свой час

Як ты кранаеш мяне...

Ты прыгожая?
Не ведаю.

Ты разумная?
Не ведаю.

Ты добрая?
Не ведаю.

Як трава пасля дажджу —
твае вочы.

А голас —
гэтак грукаюць зоркі
ў маё начное акно.

Болей
я нічога не ведаю.

Ты зноў нарадзілася для кахання

адзенне
як шумавінне

згасла ля тваіх ног

ты зноў нарадзілася для кахання

і сустрэліся нашыя вочы
і дакрануліся рукі
і затрымцелі сэрцы

і ноч
агарнула нас як хваля
і знесла
і змардавала
і выкінула

і на белым беразе дня
два загарэлыя целы
два смоленыя чаўны
вяслом да вясла

Зачытаная кніга

хто не гартаў цябе прагна
праглынаючы за ноч
за дзве
бач як грэбліва адсоўваюцца ў бок
твае суседкі па паліцы
ды ўжо яны як навюткія

няма на іхных старонках
ні плямаў ад слёз
ні адбіткаў пальцаў
ражкі не абадраныя
а аправа цвёрдая
як сухія
не цалаваныя вусны

***

Паэзія —
чыстая справа
ў брудным свеце

дужа чыстая справа
ў дужа брудным свеце

Пераклад з рускай
Аксаны Спрынчан

Настасся НАРЭЙКА

***

На рацэ — крыгаход.
Там ільдзіны, як косці,
трашчаць.
І начамі я чую,
Як крышацца суха яны.
Прачынаюся і…
Разумею: не мне абвяшчаць,
Што вярнуліся ў замак
Халодныя цені вайны.

Іх мячы адсякаюць
Святло месяцовае — змрок.
Іх цяжэзныя латы
Прапахлі тугою і ржой.
Іх пустыя вачніцы
Глядзяць у мяне. Як знарок.
І я ў замку сваім
Пачуваюся дзіўна чужой.

І яны апускаюць стамлёна
Сівыя мячы,
І сядзяць ля агню,
І маўчаць,
І глядзяць у яго.
І далёкі ідзе крыгаход
У бяззорнай начы.
І яны не заўважаць
Трымцення слабога майго.

Не заўважаць і слёз,
А сляза разбурае метал…
І наранні яны
Пераступяць нячутна парог.
І далёка, на бурнай рацэ, —
Нечуваны абвал.
І падасца: ад нас ад усіх
Адступаецца Бог.

Я малюся ў цішы,
Покуль крыгі старыя маўчаць,
Покуль цені ідуць на спачын,
І не знаюць яны,
Што за намі — вялікая сіла,
Магутная рацэ —
Наша памяць. Жывая яна?
То не будзе вайны…

***

У садзе вільготным
Дажджы паскідалі плашчы.
І травы маўчаць —
Захлынуліся белай вадой.
Трымаю аранжавы свой
Парасон, нібы шчыт.
Іду цераз сад
Падазрона спакойнай хадой.

І з плеч па руках
Незваротна сцякае вада.
І мокрай змяёй
Абдымае за шыю каса.
Сукенка залітая брудам.
Яе не шкада.
Нашто мне яна —
Бессэнсоўная гэта краса?

І вось на верандзе
Скідаю я з ног кайданы
Цяжкіх чаравікаў.
І падае ўніз парасон.
У садзе стаяць нерухома
Бязважкія сны.
І толькі дыханне яго
У гэтым доме не сон.

Ён спіць. Расплятаю касу.
А сукенка? Няхай.
Анучаю будзе, каб выцерці
Потым сляды.
О, дождж! Не сціхай!
Заклінаю цябе: не сціхай!
Ён слёз не заўважыць маіх
Сярод гэтай вады.

Я плачу заўжды, як прыходжу
Наранні дамоў.
Гляджу на яго і, здаецца,
Па крузе бягу.
Ён хутка прачнецца.
З цяжкой галавою. Ад сноў.
У вочы зірну і адчую:
Я больш не змагу.

І будзе звычайны, і просты,
І радасны дзень.
І сонца дазволіць забыць
Пра дажджы і слату.
А вечарам зноўку
Апусцяцца морак і цень.
Засне. І я зноў
Механічна касу запляту.

Ды шчыт-парасон не вазьму.
Што карысці з яго?
На полі абломкі мяча
Зарастаюць травой.
На полі, якое не ўспомніць
І твару майго,
Яму ўсё адно. А няхай!
Аб сцяну галавой.

Не помніць яно ні забітых,
Ні нават жывых.
І цягнем мы косці —
Навечна пустыя — сюды.
Штоноч заміраем
Між зорак халодных, сівых.
І слёзы сплываюць у дол
Разам з плынню вады.

Мы плачам. І скуру сваю
Адчуваем, і кроў,
І раны былыя, і холад
Ад мокрай травы.
І нашы мячы, паламаныя,
Ззяюць ізноў,
Ды іх не складзеш,
Бо метал нежывы, нежывы.

Мы тут і памерці маглі,
Але, пэўна, не лёс.
Мы сыдзем бязгучна,
Як згасне апошняя з зор.
Мы цягнем абломкі свае
Пад слязамі нябёс.
Мы — людзі, пясок ад зямлі
І каменне ад гор.

Мы цяжка скідаем адзенне.
Як латы. Тады.
І ціха ідзём да адзіных
Каханых сваіх.
Мы ім не пакажам начной,
Неадольнай жуды.
Каб ранкам прыйсці,
Мы змагаемся ноччу за іх.

Міхась СЛІВА

Рагачоўскія замалёўкі

***

Прахапіўся сярод ночы. У памяці ўспыхнуў радок Яўгеніі Янішчыц: «Пачынаецца ўсё з любві…» Следам успомнілася пушкінскае: «Я помню чудное мгновенье…», затым — «Мне бы только смотреть на тебя…» Сяргея Ясеніна, «Зорка Венера ўзышла над зямлёю…» Максіма Багдановіча.

Падумалася: як шкада, што так рана, у самым росквіце творчых сіл, пайшлі яны з жыцця. Недалюбілі, недапісалі, недажылі…

А можа, таму так ярка, насычана, інтэнсіўна яны жылі і кахалі, што павінны былі рана пакінуць гэты свет?!.

***

Аказваецца, мужнасць патрэбна не толькі на вайне, не толькі ў экстрэмальнай сітуацыі.

…На канцавым прыпынку стаіць гарадскі маршрутны аўтобус. Кіроўца ў кабіне і па тэлефоне вядзе размову з таварышам — таксама кіроўцам таго ж аўтапрадпрыемства. Скардзіцца на дрэнны стан аўтобуса, на адсутнасць запчастак. У ажыўленай, вельмі эмацыянальнай размове карыстаецца тымі самымі «папулярнымі» слоўцамі. Усё гэта чуваць у салоне аўтобуса, які ўжо амаль увесь запоўнілі пасажыры, у асноўным жанчыны і дзеці. Некаторыя затыкаюць вушы, каб не чуць слоўны бруд, адцягваюць увагу дзяцей.

Я сяджу ў самым канцы салона і думаю: «Як можна такое цярпець! Трэба тэрмінова схадзіць і папярэдзіць». Але нейкі ўнутраны голас шэпча: «Пачакай, можа, ён і сам хутка перастане брыдкасловіць…» Пакуль думаў-разважаў, кіроўца на развітанне са сваім суразмоўцам смачна вылаяўся і завёў рухавік.

І мы паехалі…

***

Паэт павінен запальваць… Толькі тады ён Паэт.

Такія думкі з'явіліся, як толькі ўзяў у рукі кнігу Леаніда Дранько-Майсюка «Акропаль» і пачаў чытаць першы верш у гэтым зборніку «Завушніцы», бо адразу нахлынулі ўспаміны маладосці…

Паэт запаліў мяне. Сапраўдны Паэт.

***

Прачнуўся ноччу, і аднекуль з'явілася фраза: «З добрым суседам доўга развітваешся». Такога нідзе не чытаў і не чуў. А сэнс вялікі: калі сусед добры, то сустрэча з ім заўсёды ў радасць, і развітвацца не спяшаешся. Хочацца пабыць разам, пагаварыць…

Паўтарыў гэтую фразу — і на душы стала светла, радасна.

Раніцай, калі расказваў аб гэтым жонцы, тая рассмяялася:

— Мендзялееў ты наш...

***

У свежым нумары «Полымя» прачытаў новую падборку нататак Уладзіміра Сцяпана. Вось гэта сапраўдныя жыццёвінкі, сапраўдная мастацкая проза! А праз некалькі дзён атрымаў «ЛіМ», дзе былі высока ацэнены гэтыя творы пісьменніка-земляка. Вось такую літаратуру з задавальненнем можна чытаць кожны дзень!

***

Успомнілася дзяцінства. Мы, 10—12-гадовыя вясковыя хлапчукі, залезлі на крыгі, якія пачалі рухацца на нашай рэчцы Ржаўка, што ўпадае ў Днепр.

Гулялі-цешыліся, а потым сталі перабірацца на бераг. Вось скочыў мой аднакласнік Коля Саракалетаў. Але няўдала: абрынуўся каля берага, намачыўся. Я ў гэты момант стаяў на крызе і рагатаў, бо вельмі ж было смешна, як ён выбіраўся з рэчкі.

А потым скочыў і я. Таксама не дапяў берага. Цячэннем павярнула мяне да крыгі, я схапіўся за яе. Добра, што там яшчэ заставаліся хлопцы, якія дапамаглі выбрацца на бераг. Вось тады я зразумеў, што не трэба казаць «гоп», пакуль не пераскочыў, і хто смяецца апошнім.

Мокры, забег да сябра Колі Марчанкі, залез на печ. А калі прыйшоў дадому, быў ужо сухі. Пра гэтае здарэнне мае бацькі даведаліся толькі праз дзень, таму мне пашанцавала, абышлося без папругі…

***

Рагачоўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы ў час святкавання Дня беларускага пісьменства было прысвоена імя Уладзіміра Караткевіча. І цяпер у фае Дома кнігі на самым прыкметным месцы заззялі яго словы: «Кожную кнігу трэба пісаць так, нібы гэта твая найлепшая і апошняя». Які цудоўны запавет для кожнага літаратара!

***

У вёску да дзядулі прыехала гарадская ўнучка з кавалерам. Хлопец быў апрануты ў модныя па тым часе штаны — кароткія джынсы са знарок зробленымі дзіркамі. Дзядуля адвёў убок унучку і ціхенька пытае:

— У яго што, няма грошай, каб купіць цэлыя штаны? Дык я магу даць, нядаўна пенсію атрымаў!

Унучка доўга тлумачыла пра сучасную моду, а дзядуля толькі ківаў галавой…

***

У маршрутку, цяжка рухаючыся з дапамогай кульбы, зайшла пажылая жанчына. Пасажыраў было нямнога, таму яна выбрала сабе найбольш зручнае месца. Твар жанчыны быў заклапочаны, невясёлы. Было відаць, што ёй баляць хворыя ногі.

Праз некалькі прыпынкаў з маршруткі зазбіраўся да выхаду сярэдніх гадоў мужчына. Звяртаючыся да кіроўцы, прамовіў:

— Вялікі дзякуй! І — шчасліва! — І тут жа, павярнуўшыся да пасажыраў, дадаў:

— Усім шчасліва!

Ажывіліся ўсе пасажыры, а ў хворай жанчыны павесялеў твар і засвяціліся вочы…

***

Ідучы з дому да аўтобуснага прыпынку, заўважыў свежы надпіс на сцяне аднаго з дамоў. Як і ў большасці выпадкаў, з граматычнымі памылкамі. Падумалася: чамусьці менавіта малапісьменныя часцей за ўсё імкнуцца крэмзаць на сценах дамоў і ў грамадскіх месцах. Няўжо ім не хапае паперы?

***

Калісьці ў школе на ўроку рускай мовы пры тлумачэнні правілаў правапісу мая настаўніца ў якасці прыкладу прыводзіла такі сказ з аднаго з твораў Антона Чэхава: «Он был в шубе, но без шапки».

Я ўспомніў гэтую фразу, гледзячы ў акно. Была цудоўная летняя раніца, стаяла цёплае сонечнае надвор'е. Па тратуары, хістаючыся, ішоў мужчына сярэдніх гадоў. На ім былі белыя летнія штаны, пантофлі на босыя ногі і… футра наросхрыст на голым целе.

Гэта ж колькі трэба было выпіць учора, каб сёння так прыфранціцца, — у футры, але без шкарпэтак!..

Дзеніслаў НІЧЫПАРОВІЧ

Двухлюбасць

Абразок

Жыву ў Беларусі змалку і гэтак абеларусіўся, што іншым разам здаецца, быццам я напраўду тутэйшы і тут мая радзіма. Аднак самасвядомасць пярэчыць: «У чалавека не бывае дзвюх радзім, Радзіма ў чалавека, як і маці, толькі адна». Таму, як бы ні здавалася, але сапраўдная мая радзіма — расійскі горад Ржэў.

У вайну яму давялося выконваць ролю падсадной качкі. Ржэўскі фронт адзіны раз за ўсю вайну інспектаваў Сталін. Дарэчы, дом, у якім была яго стаўка, стаіць незапатрабаваны дагэтуль, і ўлады не ведаюць, што з ім рабіць.

Забіты пад Ржэвам салдат з верша Твардоўскага перажывае: «Фронт горел не смолкая, как на теле рубец, Я убит и не знаю, наш ли Ржев наконец…» Спі спакойна, салдат, Ржэў наш.

На нейкі час перарвуся: прыйшлі са школы мае дочкі — дзявяты і дзясяты класы, цыбатыя, разгарачаныя яшчэ не спалай жнівеньскай спёкаю, разабралі заплечнікі, перакінуліся са мною дзяжурнымі словамі і заселі за ўрокі. «А есці?!» — «Няма калі, паназадавалі дамашкі, хаця б да ночы паспець!» — «Яны дамагаюцца, каб вы са школы адразу прафесарамі выйшлі!» — пажартаваў я, і на мяне раптам нахлынулі школьныя ўспаміны…

Была і ў мяне белая, як параход, школа. І незабыўная першая настаўніца. І юнацкая бестурботнасць з незлічонымі здарэннямі, прыгодамі і выхадкамі. Цяпер з вышыні пражытых гадоў за нейкія з іх смешна, за нейкія — прыкра і непрыемна, а за паасобныя — сорамна. Але адна непрыглядная выхадка прымусіла праз некалькі дзесяцігоддзяў моцна збянтэжыцца. Вось як гэта адбылося…

У нашым маляўнічым райцэнтры на Нёмане адзін час дырэктарам школы быў даволі прыстойны, паважны мужчына. І раптам у раёнцы пра яго надрукавалі артыкул пад назвай «Пашляк» за прыставанні да маладых настаўніц. Навіна гэта імгненна абляцела ўсю нашу неўтаймаваную, перажыўшую нямецкую акупацыю хлапечую вольніцу, і мы, у тым ліку і я, сталі, забаўляючыся, наўздагон яму крычаць «Пашля-як» і заходзіліся ад смеху.

Неўзабаве ён з'ехаў. Але вось аднойчы зусім нечакана я сустрэў яго ў краме ля Акадэміі навук — славутага навукоўца-археолага. Ён мяне, вядома, не пазнаў, а я імгненна адзначыў усе выкліканыя часам перамены ў яго профілі і постаці. Адчуўшы, як гараць вушы, я спехам выслізнуў з крамы.

Увесь астатак гэтага дня мне было вельмі сумна, калі-нікалі ўсплывалі шчымлівыя мелодыі школьных песень…

Сёння кастрычнік змяніў верасень, на двары, можна сказаць, самая восень, аднак няма ні макрэчы, ні слаты. Дні стаяць сухія, сонечныя, трохі ветраныя. Па палінялым небе лёгка слізгаюць празрыста-светлыя, часам падцемненыя затуманенай імглою бясформеныя аблокі. Калі-нікалі яны расступаюцца і адкрываюць прагалкі неба незвычайнай блакітнасці. Няма панурай тугі па мінулым леце, безнадзейнай маркоты з-за будучага надыходу халоднага перыяду года, а на душы легка і нават весела.

Кладзёмся спаць мы рана, каб дочкі перад школаю добра адпачылі. Падурэўшы ў пасцелях, яны на пачатку дзясятай гадзіны ўжо моцна засынаюць. Гэта якраз і мая, жаўрука, пара адпачываць. У самую глухую ноч я ўжо на нагах, што-небудзь раблю, чытаю ці сузіраю начное неба — відовішча, скажу я вам, дзівоснае і маляўнічае. Здаецца, неба адно, але колькі на яго бяскрайнім купале цікавых змяненняў, з'яў і дзеянняў!

То яно ляжыць над намі ў велізарнай вышыні — бясстраснае, цямнюсенькае і няма на ім ні зоркі, ні месяца. На зямлі пануе непраглядная цемра і нерухомасць. Нейкая неакрэсленая немінучасць, пакуль не ўлягуся спаць, грызе маю ўразлівую душу.

То яно, як акіян, бурнае. Вугольна-чорныя аблокі круцяцца ў вар'яцкім кругавароце вакол залацістага месяца: то цалкам яго закрываючы, то выхопліваючы з гэтай воблачнай каламуці толькі асобныя, што ззяюць фасфарычнымі ўспышкамі, кавалкі месячнага дыска. У такія ночы на душы неспакойна і трывожна, я кладуся ў ложак і з галавою хаваюся пад коўдру.

Але бываюць чароўна-казачныя месячныя ночы, калі паветраная цёмна-сіняя зорная заслона шчыльна адгароджвае зямлю ад небасхіла, пасярэдзіне яго царкоўнай лампадаю вісіць нерухома-маўклівы серабрысты месяц, а ў пасвяжэлым паветры лунае дух цішыні і спакою. У такія ночы я ўраўнаважаны, спакойны і ціхмяны, мне хораша ўспамінаецца, думаецца, аналізуецца і марыцца. Марам усе ўзросты пакорлівы. Па-ранейшаму жадаецца, каб яны здзяйсніліся, і я, як у маладосці, чакаю якога-небудзь цуду. Мары і рэальнасць сугучна пераклікаюцца.

Але ж ад маладосці да дня сённяшняга сплыло нямала вады. Яна то бегла напеўнымі ручаямі, то хвастала шчымлівым гулам, як з вадасцёкавай трубы падчас залевы, і вядома ж, багата змыла з маёй свядомасці і знесла без шкадавання і развітальнага пацалунку ў бяскрайні акіян чалавечых эмоцый і адносін.

Негледзячы на гэта, ў маёй душы захавалася грамадзянская неабыякавасць да ўсяго, што ў нас дзеецца. Народжаны Расіяй, але выгадаваны Беларуссю, я часта задумваюся: дзе ўсё ж такі мая мацярынская калыска: у горадзе ля вытокаў Волгі, у наваколлях якога дагэтуль ляжаць непахаванымі шматлікія астанкі загінулых савецкіх салдат, альбо ва ўтульным беларускім райцэнтры, дзе нас, вязняў (мне тады было два гады), недавезеных да Германіі з-за таго, што беларускія партызаны падарвалі чыгунку, немцы загналі ў гета, папярэдне знішчыўшы яўрэяў.

У беларускім гарадку я вырас, у ім прайшлі мае дзяцінства, маленства, юнацтва, мужчынскае сталенне. Але нарадзіўся я ў Расіі, і маці мая была цвярской чаёўніцай, і дагэтуль я перажываю за Расію, а ў цяжкія для яе дні хварэю разам з ёю, а калі пачую незнарок назву майго роднага горада, наскрозь пранізваюць вострыя балючыя іголкі.

Быццам я не такі ўжо слабы духам, але не стае сіл аддаць якому-небудзь з гэтых двух гарадоў перавагу. Вось я і думаю-гадаю, дзе ж усё-такі мой родны кут?

не толькі ў каталогах

Планета Арсеня Ліса

XIII навукова-краязнаўчая канферэнцыя, прысвечаная навуковай дзейнасці доктара філалагічных навук, пісьменніка Арсеня Ліса, прайшла ў Маладзечанскай цэнтральнай бібліятэцы. Заўзятаму фалькларысту сёлета споўнілася б 85 гадоў. Калісьці цікавасць да народнай песні і да грамадскага нацыянальнага руху 20-х гадоў мінулага стагоддзя вызначыла тэмы экспедыцый і лёс даследчыка Арсеня Ліса ў навуцы.

Арганізатар канферэнцыі, краязнаўца, выдавец, пісьменнік Міхась Казлоўскі адзначыў, што найбольшая заслуга Арсеня Сяргеевіча ў тым, што ён быў не толькі дбайным збіральнікам фальклору, але і першым даследчыкам, які вывучаў навуковую і літаратурную спадчыну тэарэтыка мастацтва Мікалая Шчакаціхіна, мастака Язэпа Драздовіча ды многіх слынных беларусістаў. Супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі падрыхтавалі фотапрэзентацыю, у якой можна было ўбачыць шмат рэдкіх фотаздымкаў з сямейнага архіва А. Ліса.

На судакрананні дзвюх слынных асоб — Арсеня Ліса і Язэпа Драздовіча — акцэнтаваў увагу краязнаўца Валеры Бурэнь. Абодва краязнаўцы насуперак абставінам падымалі пласты занядбанай гісторыі краю, стваралі і ўзбагачалі беларускую культуру. Іх, па словах выступоўцы, аб'ядноўваў адзін грамадзянскі доўг — паказаць канкрэтную, а не абстрактную надуманую Беларусь.

Па колькасці зробленых запісаў Арсень Ліс — у пяцёрцы найбольш плённых збіральнікаў беларускага фальклору, адзначыла малады навуковец Яніна Грыневіч з інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі. Арсень Ліс быў таленавіты сцэнарыст, лічыць вядучы рэдактар студыі «Летапіс» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», пісьменнік Уладзімір Мароз. Шкада, што многія фільмы, знятыя па яго сцэнарыі, пакуль не алічбаваныя: яны не страцілі актуальнасці па сёння.

Паэтэса, вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Людміла Сільнова расказала пра электронны каталог, што ўтрымлівае творы з друкаванай спадчыны Арсеня Ліса, у тым ліку і вельмі кранальныя лірычныя вершы. На думку выступоўцы, Арсень Сяргеевіч стварыў сваю планету Беларусь, якая асацыюецца з планетамі з казкі А. Экзюперы «Маленькі прынц». Баладу, прысвечаную Арсеню Лісу, прачытаў паэт Віктар Шніп.

Ала КЛЕМЯНОК

Клуб у бібліёбусе

Бібліёбус Мастоўскай раённай бібліятэкі сумесна з супрацоўнікамі сельскага клуба «Галубы» адправіліся ў першы перасоўны экспрэс-маршрут «Нам 75!», прымеркаваны да юбілею Гродзенскай вобласці.

Для жыхароў вёсак Галубы, Шасцілы, Руда-Ліпічанская прадставілі літаратурна-музычную кампазіцыю «Мой родны край, цябе мы славім!». Расказалі пра незвычайнае месца пад назвай Куба каля вёскі Галубы, прыроду рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Ліпічанская пушча», тэрыторыя якога ў гады Вялікай Айчыннай вайны стала галоўнай партызанскай базай, пра неўміручы подзвіг ураджэнца в. Руда-Ліпічанская Міхаіла Белуша, які паўтарыў подзвіг Аляксандра Матросава і інш. Прагучалі імёны землякоў, якім у 2019 годзе спаўняецца 75 гадоў. Свае музычныя нумары вяскоўцам падарыў гурт «Незабудкі» сельскага клуба «Галубы», удзельнікі якога выканалі песні: «Мая радзіма тут», «Маці, матуля, мама», «Прывітальная». А яшчэ была прадстаўлена кніжная выстаўка «Гродзеншчына — край мой над Нёманам».

Вольга КОРШУН,
метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Мастоўскай раённай бібліятэкі

Мост з мінулага ў будучыню

Чалавек знаходзіцца перад гімалаямі бібліятэк у якасці золаташукальніка, якому патрэбна знайсці крупінкі золата ў масе пяску, казаў рускі фізік С. І. Вавілаў. Як змяніліся з таго часу стратэгіі бібліятэкі? Пра тое, чаму бібліятэкар — прафесія будучыні, разважае дэкан факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Юлія ГАЛКОЎСКАЯ.

— Сёння бібліятэкар, па сутнасці, арганізоўвае доступ да інфармацыі... Ці не зводзіцца яго функцыя да мінімуму, ці не выглядае фармальнай?

— За фармальнымі, на неспрактыкаваны погляд, задачамі — велізарная праца вялікай колькасці спецыялістаў, якія выконваюць разнастайныя і часам вельмі працаёмкія функцыі. Нашы бібліятэкі валодаюць унікальнымі фондамі дакументаў, дзе ёсць як сучасныя выданні, што дапамагаюць развівацца навуцы і тэхналогіям, так і рэдкія, адметныя, што ўяўляюць гісторыка-культурную каштоўнасць.

Асобнымі пунктамі ў ведах сучаснага бібліятэкара-бібліёграфа стаяць уменні, звязаныя з арганізацыяй сацыякультурных мерапрыемстваў (напрыклад, «Бібліяноч», сустрэчы з паэтамі і пісьменнікамі, сустрэчы дзяцей з літаратурнымі героямі), правядзеннем навукаметрычных даследаванняў, ацэнкай эфектыўнасці розных напрамкаў дзейнасці і інш.

У наш час функцыі, якія выконвалі бібліятэкі стагоддзямі, напаўняюцца новым зместам і новымі сродкамі рэалізацыі. За ўяўнай прастатой хаваюцца глыбокія веды прадметнай галіны, адпрацаваныя ўменні і вопыт. Класіка звычайнага ўспрымання жыцця такая: маўляў, усе могуць вучыць, лячыць і будаваць. Але, як высвятляецца, такімі ж вонкава простымі справамі з'яўляюцца праграмаванне, пошук, апрацоўка, аналіз інфармацыі. Аднак гэта павярхоўнае ўспрыманне.

— Многія скептычна рэагуюць на назву прафесіі «бібліятэкар». Ці не варта змяніць назву — тады і прэстыж павялічыцца, і цікавасць узрасце? Па аналогіі таго, што перайменаваны ж бібліятэчны факультэт у факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый...

— Выдатны маркетынгавы ход. Аднак мы хацелі б быць сумленнымі перад нашымі абітурыентамі. Мы рыхтуем спецыялістаў для бібліятэчна-інфармацыйных устаноў, і па размеркаванні нашы выпускнікі ідуць працаваць у бібліятэкі. Іншы момант — веды, якія мы даём. А мы фарміруем унікальныя ўменні, звязаныя з эфектыўным пошукам інфармацыі. Акрамя таго, вучым распрацоўваць сацыякультурныя праекты і рабіць ацэнку розных напрамкаў дзейнасці бібліятэчна-інфармацыйных устаноў. Усё гэта ў сукупнасці служыць добрай дапамогай для далейшага працаўладкавання. Нават калі нашы выпускнікі з часам вырашаюць змяніць від дзейнасці, то маюць цудоўны багаж ведаў, які дазволіць лёгка пераключыцца ў іншую працоўную плоскасць — у лагістыку, кадравы менеджмент (HR), рыэлтарскую дзейнасць і іншыя галіны, дзе неабходна ўмець інфармацыю збіраць, абагульняць, аналізаваць і прымаць на яе аснове абгрунтаваныя рашэнні.

Так, безумоўна, мы разважаем аб наданні спецыяльнасці больш ёмкай назвы, якая ў поўнай меры адлюстроўвае яе рэальнае напаўненне. Аднак аб першакрыніцы забываць не варта.

— Некаторыя лічаць, маўляў, кар'еры тут не пабудуеш…

— Кар'еру можна пабудаваць у любой прафесійнай сферы. Было б жаданне, працавітасць і імкненне стаць карысным. Можна прывесці прыклады: якіх поспехаў дабіліся выпускнікі спецыяльнасці «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць». Значнай фігурай у бібліятэчнай справе з'яўляецца Раман Матульскі — дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, доктар педагагічных навук, прафесар. У прафесійным асяроддзі добра вядомы Аляксей Скалабан — у цяперашні час эксперт некамерцыйнага партнёрства «Нацыянальны электронна-інфармацыйны кансорцыум» (НП «НЭІКАН»), да гэтага займаў пасаду дырэктара Навуковай бібліятэкі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Іна Віктараўна Юрык — старшыня Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі і ў цяперашні час дырэктар Навуковай бібліятэкі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

У модным бізнесе вядомасці дамаглася і зрабіла ўнікальную кар'еру выпускніца бібліятэчнай спецыяльнасці Інэса Семчанкова, заснавальніца і ўладальніка моднага дома «Юнона».

У сістэме дзяржаўнага кіравання — Ірына Дрыга, доўгі час займала пасаду першага намесніка міністра культуры Рэспублікі Беларусь.

Практыка і жыццёвы досвед паказваюць, што кар'ера і спецыяльнасць «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць» — паняцці сумяшчальныя. Уменне рацыянальна мысліць, парадкаваць, рабіць абгрунтаваныя высновы і ладзіць, камунікаваць з прадстаўнікамі розных сацыяльных інстытутаў — неад'емныя складнікі прафесіянала бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.

— А не думаеце, што прафесія бібліятэкара сальецца з іншымі спецыяльнасцямі, і бібліятэчны спецыяліст вычарпае сябе, яго заменіць робат...

— Прафесія бібліятэкара-бібліёграфа можа пашырыць свае межы, напоўніцца новымі сэнсамі і зместам, але знікнуць — не. Пакуль для нашага грамадства важныя культура, навука, традыцыі, кніжная, літаратурная і навуковая спадчына, пакуль важныя веды — бібліятэкі будуць развівацца і жыць.

— Цяпер кніжніцы пашыраюць сваю прастору ў мабільных дадатках. Наколькі гэта запатрабавана?

— Бібліятэкі ў мабільных дадатках — будучыня, якая ствараецца ўжо цяпер. Мяркуецца, што з дапамогай мабільных дадаткаў можна будзе ажыццяўляць пошук у электронных каталогах бібліятэк, знаходзіць апісанне дакументаў, выверанных экспертамі і прафесіяналамі, адкрываць паўнатэкставыя дакументы, ствараць уласную падборку дакументаў, даведвацца, у якой чытальнай зале ці ў якой бібліятэцы знаходзіцца дакумент. У якасці прыкладу таго, што такая задача ўжо вырашаецца, можна прывесці Нацыянальную электронную бібліятэку Расійскай Федэрацыі (НЭБ). Гэта дзяржаўная інфармацыйная сістэма, якая ствараецца Міністэрствам культуры Расійскай Федэрацыі пры ўдзеле найбуйнейшых бібліятэк, музеяў, архіваў, выдаўцоў і іншых праваўладальнікаў. Аўтарамі праекта прадугледжваецца магчымасць свабодна чытаць большую частку дакументаў з фонду на партале НЭБ, а таксама з дапамогай мабільных дадаткаў.

— Сёння шмат якія бібліятэкі закрываюцца…

— Сітуацыя не такая дрэнная, як усе думаюць. Ні з адной краінай мы не можам параўнацца ў колькасці кніжніц. У нас больш чым 7 тыс. кніжніц, публічных — 2,8 тыс. У праграме «Культура Беларусі» прапісана дакладна, што бібліятэкі скарачаюцца па аб'ектыўных фактарах: памяншаецца колькасць сельскіх жыхароў, многія цягнуцца ў горад, і такім чынам ідзе скарачэнне сельскіх бібліятэк. Назіраюцца інтэграцыйныя працэсы: кніжніцы аб'ядноўваюцца — на базе некалькіх робіцца адна (напрыклад, школьныя злучаюцца з сельскімі). Сказаць, што бібліятэкі зжываюць сябе, таму што ім не хапае фінансавых сродкаў або да іх губляецца цікавасць, нельга. У рэшце рэшт мы жывём у агульнасусветнай сістэме. Паглядзіце на замежныя бібліятэкі: яны дзейнічаюць, і ніхто не кажа, што яны знікнуць. Няўжо Беларусь настолькі ўнікальная, што тут бібліятэкі вымруць з прычыны незапатрабаванасці?! Спецыялісты возьмуць на ўзбраенне актуальныя веды і ўменні і зробяць з кніжніц тое, што запатрабавана часам. Можа, у нас фінансавых сродкаў менш (чым за мяжой). Але важна, што бібліятэкі ўмеюць знаходзіць спонсараў, сяброў.

Калі гаварыць пра Беларусь, то нашы бібліятэкі цяпер на пераходнай стадыі. Для параўнання — Расійская дзяржаўная бібліятэка для моладзі. Там так арганізавана прастора — што як дадому прыходзіш: зоны для адпачынку, трэнажорная зала. І няма камп'ютараў — а толькі прылады, каб наведвальнік прыйшоў са сваім ноўтбукам. Унізе — залы-рэлакс: патэфон, вінілавыя пласцінкі. Пры ўваходзе — рэтра-аўтамабіль. Там няма такога, каб цябе запісвалі: прыклаў да электроннай прылады свой дакумент і пайшоў. Вяртаеш кнігі — кладзі на электронную прыладу. І ўсё за некалькі секунд. Ніякіх чэргаў. Гэтая бібліятэка — каардынацыйны вядучы метадычны цэнтр кніжніц Расіі. А нарады — анлайн. Да рэдкіх кніг — адкрыты доступ, кансультуе спецыяліст. Ахвотным старыя кнігі памацаць рукамі не забараняецца. На тэрыторыі бібліятэкі зрабілі студыю гуказапісу, можна паглядзець фільм з фонду ў свабоднай атмасферы. Вось прыклад таго, як кніжніца адаптуецца да патрэб карыстальніка. Зараз у Маскве модна маляваць, усе гэтаму вучацца. Што зрабіла бібліятэка? Знайшла спецыяліста, які праводзіць заняткі. А калі гэта ўзялі на ўзбраенне многія кніжніцы, прыдумвае новую «фішку». І на апераджэнне. Такая бібліятэка ніколі не памрэ.

Галоўная наша стратэгія — кадры, якія ўмеюць адпавядаць часу і мяняцца разам з абставінамі, якія валодаюць актуальнымі ведамі, тэхналогіямі.

Кніжніцы — неад'емная частка грамадства і змяняюцца разам з ім. Бібліятэкі — культурны мост з мінулага ў будучыню. Яны зберагаюць літаратурную, навуковую спадчыну і з'яўляюцца гарантам таго, што паміж пакаленнямі захаваецца пераемнасць. Бібліятэкі дазваляюць быць свабоднымі. Тут хацелася б працытаваць Ніла Геймана: «Бібліятэкі — гэта свабода. Свабода чытаць, свабода мець зносіны. Гэта адукацыя (якая не заканчваецца ў той дзень, калі мы пакідаем школу ці ўніверсітэт), гэта вольны час, гэта прытулак і доступ да інфармацыі». Выключыце бібліятэкі — і гэта будзе крок да таго, каб патануць у інфармацыйным патоку. Сусветна вядомы рускі псіхолаг Аляксей Мікалаевіч Лявонцьеў яшчэ ў сярэдзіне XX стагоддзя мудра зазначыў: «Лішак інфармацыі вядзе да збяднення душы».

Наталля СВЯТЛОВА

На тэрыторыі душы

Штогод на Кіеўшчыне ладзіцца ўсеўкраінскае свята паэзіі «Бідэнка-фэст». Мікола Бідэнка (1951—2016) — адзін з найвыбітнейшых паэтаў Украіны. У шаснаццацігадовым узросце ён атрымаў інваліднасць з прычыны траўмы пазваночніка. Скончыў факультэт журналістыкі Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі. Аўтар некалькіх паэтычных зборнікаў, у 1993 годзе стаў лаўрэатам літаратурнай прэміі імя Васіля Сіманенкі НСПУ за кнігу «Важкий метал». Яго любяць і шануюць за праў-дзівасць у адлюстраванні часу з адчуваннем усіх яго «балючых месцаў».

Арганізатар мерапрыемства — малады паэт, вучань Міколы Бідэнкі Аляксандр Букацюк, што сведчыць аб пераемнасці пакаленняў: абсалютную большасць удзельнікаў фестывалю складае творчая моладзь Украіны. Вершы гэтых маладых аўтараў змешчаны ў альманаху «Метро всередині нас», на старонкі якога, між іншым, трапіла і паэзія Юліі Алейчанкі, адзінай прадстаўніцы з Беларусі. Колькі твораў удзельнікаў гэтага свята і прапаноўваюцца да ўвагі чытачоў.

Мікола БІДЭНКА

***

яна —
за межамі кахання... гэта быццам
жыўцом
быць на тым свеце
ён —
хіба любоў ратуе ад нябыту
наш першы крык
гэта аплакванне ўласнай смерці
потым мы будзем плакаць толькі
па страчаных дробязях
яна —
па каханні можна плакаць
але нельга страціць
каханне нібы ўспышка золаку —
калі яно згасае
то пакідае святло
ён —
але ў кожнага свая столь
упрэшся позіркам у неба
і ты на дне і неба дно
адзінокі чалавек — то ўжо не для цябе
калі ты адзін — то ўжо ні для кога

па той бок кахання...
гэта значыць гарэць жыўцом
калі ніводзін прамень
не выходзіць за межы сэрца

***

адбываецца адасобленасць
у якойсьці сюррэалістычнай плыні
быццам задушаны паспех
хтосьці валачыў за ногі ў траву
праз расхінутыя насцеж рэбры

позірк праходзячы міма ўласнага я
перакрыўляецца ў грымасе
чый твар ён намагаецца прыгадаць
ува мне
з тых што таксама праходзілі міма
а можа гэта і было маё я
што перакрыўляла кагосьці

я сапраўды стараюся прыстойна
з сябе выходзіць у свет
ды што не апранеш —
рукавы на выраст
каўнер на пятлю

правесці б раскопкі на тэрыторыі душы —
ці праўда нам падарылі
той скрадзены агонь
што падпаліў нашы галовы

а сэрца як дзіця
хоча збегчы шпацыруючы па небе
і я за ім быццам ланцуг
што згубіў вызвалены сабака

я бачу там фрэскі вачэй
але не ведаю ці плачуць яны
я знаходжу вішні вуснаў
але не ведаю ці маюць яны
смак пацалункаў
я кранаюся грудзей
і адчуваю схаваную ў малацэ
ласкавасць рук
што махаюць мне — бывай
а сэрца…
Госпадзе дзе мне знайсці сэрца

я паспяваю сказаць люблю цябе
люблю
і чую як уцякае ўсё далей і далей
за ёю мой голас
як вяртаецца поўня і зноў
і зноў паўтараецца мая доля —

вось так я ляжу ў высокай траве
гляджу на неба і закохваюся
у кожную хмарку

у крывізне маўленчых люстэркаў
то не вівісекцыя экзістэнцыі прышэльца
людзі добрыя гэта маё жыццё
гэта як бы сабака пісаў пра сабаку
ён не можа не выць
не смярдзець псінай
бо й душу ён можа знайсці
толькі там дзе вы
выкідаеце смецце

Пераклад з украінскай
Міколы Адама

Вікторыя ШЭВЭЛЬ

***

а дашлі мне мора
у чоўніку камерным — сэрцы
разгайдай разгані яго
у сабе паміж мегаэмоцый...
яшчэ асядлай вышэйшую хвалю
і прычашы ёй абшары
песняю «месяц на небе»
адкупішся
што не дома.
і ні за што не спыняйся
нягледзячы на спакусу і стому...
а апрані мяне морам
пявучым
ад шчасця ў шоку!

***

Спальні нашы маўчалі тыднямі.
Адчыняліся няўпэўнена.
Пахлі охраю, спалі дзіўнымі
Падарожнікамі пасцельнымі.
Загадалі ім быць паслухмянымі,
Сонца разам не зводзіць з месяцам...
Я была там у змроках — паваю —
Толькі ты казаў, што мядзведзіцай.
Адышоў на крок да імпэтнасці,
Пазбіраў вакол свет спакуслівы,
Што з вачэй да маёй прысутнасці
Выйграваў, спакушаў шляхетнасцю...
І прайшоў за мяжой белаю
Ці дзвярыма... Як цень, незаўважаным.
Прывядуць мяне неяк дзеваю...
Тады неба агульнае ўзважым.

Пераклад з украінскай
Міколы Адама

Уладзімір ПРЫСЯЖНЮК

***

Гэта трызненне або недарэчны жарт:
Яшчэ не забыла водар твой дому
прастора,
Яшчэ не адчай — хіба што звычайны
жаль
Застыў у паветры і ціха сядае
на шторы.

Учора было тут светла — ТЫ была тут!
А зараз мяжа пралягла паміж сёння
і ўчора,
І пакуль што бяздзейсная сіла
проціатрут,
І белае выглядае атрутна-чорным.

Ты проста сышла, нячутна, нібыта
ў мрою,
І цэлы сусвет зачыніла, прыкрыўшы
дзверы,
І налятаюць гарчынкі спалоханым роем,
Каб разбіць цішыню на рыфмы
і на памеры...

Пераклад з украінскай
Паўла Астравуха

Аляксандр КАЗІНЕЦ

***

калі б я быў Богам
стварыў бы мора астатнім
каб у нядзелю
ляжаць на пляжы пад сонцам
размаўляць з чайкамі
паклікаў бы Адама
і сказаў
глядзі чалавеча
гэта завецца прыгажосцю
так і будзе спрадвеку
і вырастуць горы наўкола
хвалі павысякаюць у скалах жытло
душам тваіх нашчадкаў
ды іх недасканалым целам
якія (я спадзяюся)
за некалькі тысячагоддзяў
вы навучыцеся даглядаць самастойна
калі ў першы раз прывядзеш
сваю жанчыну да мора Адаме
пакажы што яно добрае
пакажы якое вольнае і бязмежнае
навучы яе спакойна заходзіць
і выходзіць з вады ў шторм
адчуваць стыхію
знаць як яе супакоіць
тады жанчына твая
пакахае цябе Адаме
так аддана і шчыра
як я — гэты вялізны свет
вачыма сонца і хараства
пяшчоты і дараванння
і будзе так заўжды
нават калі ты
усё прыўкрасная і чыстае ў сабе
знішчыш за тысячу год
сумневаў і страхаў
праблем
і штодзённых глупстваў
а галоўнае
недахопам любові
якую я стварыў першай...

Пераклад з украінскай
Паўла Астравуха

Паўло КАРАБЧУК

Як мне без цябе

Як спод камізэлькі грэе ўзімку сабачку,
як паветрам плывуць ледзяшы,
што месяц таму ўпалі з дахаў,
празрыстую тваю скуру бачу
ў рухах птахаў.

Каго білі ў твар кірзачом ці пад дых,
каму засталася пара сухотных гадоў,
знае добра, як мне без цябе. І няма
ў ведаў тых
ні дна, ні берагоў.

Калі б пад пазногці кітайскія палачкі
заганялі,
калі б п'еса, што алігафрэн паставіў,
забіла поўную залу,
мы выжылі б, мы стрывалі б, —
плазам, але выпаўзалі.

Колькі б мудрасці я ні спазнаў, будучы
кніжнай паліцай,
альбо ні глядзеў на твары, пасля смерці
застылыя ў грацыі,
абы хоць зрэдку цябе бачыць пальцамі —
нібы акно прачыняць раніцай.

Цэлы месяц выкінуў у чаканні —
на сметнік аднёс ахапак.
Можаш туды зазірнуць, каб ведаць,
як мой пачынаўся дзень —
як са страўніка голад бярэ пачатак,
а голас — з грудзей.

Калі нам давядзецца зводзіць рахункі, —
ведаем кошт здароўю, прайшлі не адзін
каранцін, —
доўга не будзем рэчы складаць у сумкі.
Начэй, што ядналі нас, безліч. Ранак,
які яднае, — заўжды адзін.

У месцы і часе наступнай сустрэчы
я быў стопяцьсот разоў.
А ўсё ж сустрэнемся як, хай выйшаў
да рэшты тэрмін,
і пра гэта пісаць — гонару шмат
для слоў,
свет перастане быць шэрым.

Калі хтось даглядае расліну,
удзячны быць мусіць таму, хто раней
адпаіў вадой.
Настолькі мужы ўсе ў адным мужчыну,
настолькі ўсе жонкі ў адной.

Пераклад з украінскай
Яны Будовіч

Назарый НЕСЦЯРУК

***

не хавай ад мяне аблічча
яно як панурае кастрычніцкае лісце
яно як стрэл, што цаляе трапна
як холад альпійскі

прыносіць боль

як неба пахмурнае

як навальніцы
дажджы

як сотні кінжалаў
усярэдзіне душы

як вытрымка марная

як імгненная смерць
мне так часта твае раны смыляць

***

халоднай гарбатай шклянку напоўню
застануся адзін
у бязмежным
сусвеце

нібыта камусьці гукаю
бывай

а словы мае па свеце
цярусіць
вецер

і зноўку будзённасць, меланхолія,
пігулкі ды стома
забіваюць
паволі

з апошняе моцы завяршаецца дзея
адзін крок да адчаю
ці любові

апошняя спроба — змяніць рэчаіснасць
апошні шанец — сябе не ашукваць

пакуль слова — гэта
твая вечнасць

навучыся ў яе верыць
не забываць

Пераклад з украінскай
Янкі Лайкова

Яшчэ 15!

У Беларусь вяртаюцца работы Шрагі Царфіна

Новапрыбылая калекцыя вядомага прадстаўніка Парыжскай школы родам са Смілавічаў стала найбуйнейшай у краіне. Амаль год Пасольства Беларусі ў Францыі вяло перагаворы з нашчадкамі Шрагі Царфіна і дасягнула поспеху. У той час як для музеяў і збораў вялікім гонарам з'яўляецца валоданне нават некалькімі работамі знакамітага мастака, прывезеныя ў Беларусь пятнаццаць гуашаў і палотнаў рыхтуюцца быць паказанымі ў Мінскім абласным краязнаўчым музеі ў Маладзечне.

Праект па «вяртанні» спадчыны мастака ажыццявіла Пасольства Беларусі ў Францыі сумесна з Групай кампаній «А-100» — транспарціроўка каштоўнага грузу на радзіму жывапісца завершана ў пачатку мая. У Беларусі мастак ужо прадстаўлены ў зборах Нацыянальнага мастацкага музея, карпаратыўнай калекцыі «Белгазпрамбанка», музеі «Прастора Хаіма Суціна» ў Смілавічах, але новы — яго ўласнікам з'яўляецца «А-100» — цяпер найбуйнейшы.

Шрага Царфін нарадзіўся ў мястэчку Смілавічы Мінскай губерні (як і Хаім Суцін, якога ведаў з дзяцінства). З 1914 года вучыўся ў Мастацкай акадэміі ў Іерусаліме, потым пераехаў у Берлін, нарэшце аказаўся ў Францыі, грамадзянінам якой памёр у 1975 годзе. Царфін вядомы не толькі карцінамі, але і жывапісам на тканіне, ілюстрацыямі да кніг. Творы прадстаўніка Парыжскай школы набываліся знакамітымі калекцыянерамі Эленай Рубінштэйн ды Аліксам дэ Ротшыльдам яшчэ пры жыцці мастака.

Вяртанне карцін у Беларусь, вядома ж, называецца так умоўна — дагэтуль іх, створаных у Францыі, тут ніколі не было, але спадчына знакамітага земляка ўваходзіць у лік культурных каштоўнасцяў краіны, работа па збіранні якіх актывізавалася ў апошнія гады.

Паводле слоў саветніка па пытаннях культуры Пасольства Беларусі ў Францыі Віталя Корнева, дасягнуць дамоўленасці аб набыцці пятнаццаці гуашаў і палотнаў Царфіна было цяжка: «Нашчадкі мастака не маюць патрэбы ў грашах, але яны вельмі зацікаўленыя ў захоўванні і распаўсюджванні памяці аб сваім бацьку і дзядулю. У першую чаргу яны клапаціліся аб тым, каб гэтыя работы не трапілі ў такую прыватную калекцыю, у якой іх ніхто не зможа пабачыць. Іх галоўным пытаннем было, ці будуць людзі мець магчымасць паглядзець карціны».

Як толькі ўсе патрэбныя працэдуры па падрыхтоўцы работ да экспазіцыі завершаць, яны будуць выстаўлены ў музеі ў Маладзечне, бо Шрага Царфін паходзіць з Мінскай вобласці. Пасольства асабліва адзначае такія набытыя карціны, як «Вялікая ваза ў охравых танах» 1965 года, «Зялёны асабняк у г. Анфлёр» і «Начны марскі пейзаж» прыкладна 1950 года.

Пасольства Беларусі ў Францыі працягвае работу па вяртанні культурных каштоўнасцяў нашай краіны — на гэты момант вядуцца перагаворы аб набыцці твораў яшчэ некалькіх прадстаўнікоў Парыжскай школы родам з Беларусі.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

Загрузка/перазагрузка?

Выбраць рэжым мастацкіх пошукаў праз «Арт-Мінск»

Алена Шаціла «Памяць. Слуцкі пояс».

Прыбіральшчык у памяранцавай камізэльцы стаў змятаць у савок раскіданую паперу — змагаўся такім чынам з мастакамі, якім бракуе моцы. Хадзіў сярод выступоўцаў, якія адкрывалі другі фестываль мастацтваў «Арт-Мінск», што сёлета праходзіць на 16 сталічных пляцоўках. Гэтым разам арганізатары атрымалі больш чым 800 зваротаў, абралі для паказу больш як 250 аўтараў. «Наколькі моцныя і арыгінальныя творы?» — хацелася спытаць услед за перформерам, які ўдакладніў словы прадмоў.

— Традыцыйна ў выяўленчым мастацтве людзі бачылі адказы на пытанні: што такое прыгажосць, ісціна і дабро. У пошуках адказаў мастацтва дасягнула пэўных вышынь, — адзначыў дарадца старшыні праўлення «Белгазпрамбанка» Уладзімір Сажын. — Потым Оскар Уайльд сказаў, што ўсе адказы ў галаве таго, хто глядзіць. Сучаснае мастацтва, якое моцна змянілася з тых часоў, — гэта мастацтва не адказаў, а мастацтва пытанняў. Паколькі пытанняў больш, чым адказаў, мастацтва страціла ў дасканаласці, але стала больш шматаблічным. Сёння на выстаўцы, якая бярэ новую вышыню, мноства агучаных пытанняў, удала расстаўленых куратарам выстаўкі.

Дзеля таго, каб прадумана аб'яднаць творы ў экспазіцыю, куратарам запрасілі Ілью Шыпілоўскіх, арт-крытыка, куратара і дырэктара расійскай арт-галерэі «Ельцын-Цэнтр». Ён адразу ж прапанаваў адказ на адно з галоўных пытанняў, што можа ўзнікнуць у гледача: сіла мастацтва — у магчымасці прыцягваць на сябе ўвагу.

Але свае адказы шукаць усё ж хочацца: што гэта, чаму так і дзеля чаго? У Палацы мастацтваў яны пачнуцца ўжо пры ўваходзе. Выстаўка — як звычайна, творы — і творы, у розных тэхніках, карціны, скульптуры, аб'екты… Але раптам у глыбіні залы ўзнікаюць назвы замежных галерэй: эстонскай *The SEDARTE Gallery* і латвійскай *Museum EPAC/Museum of Exhibitions of Private Art Collections*. Сёлета на фестывалі сапраўды можна пабачыць творы мастакоў з балтыйскіх краін, расіян і ўкраінцаў. Прыцягвае: тут рух, ідзе бойкае жыццё, і нашы мастакі з задавальненнем прыйшлі на знаёмства. Неабыякаваму гледачу захочацца зразумець: ці ёсць розніца ў тым, як бачаць свет іншыя, а як яго бачаць тыя, хто адлюстроўвае наша светаадчуванне? Ці ёсць розніца ва ўспрыманні часу (не толькі жыццёвага, але і мастацкага)?

Наогул, пытанняў стала больш, адзначылі на адкрыцці. І сапраўды, дыпціхаў і трыпціхаў у прасторы Палаца мастацтваў больш. І куратар карпаратыўнай калекцыі «Белгазпрамбанка» Аляксандр Зіменка не хаваў задавальнення, што гасцям сталіцы будзе што паказаць: «Арт-Мінск» праходзіць у рамках культурнай праграмы II Еўрапейскіх гульняў. Але калі мастацтва вызначае пэўную прастору, то яно найперш скіраванае на тых, хто жыве тут… Зрэшты, і «Беларускую Афрыку» пабачыць можна, і наша бачанне Егіпта, і шмат сваіх этнасімвалаў, якія ўплятаюцца ў работы, злучаючы народы, культуры, часы. І хочацца знайсці пункт, з якога выцякае наша «цяпер» у мастацтве (і не толькі, бо гэта люстэрка). Мо пункт там, адкуль вылятаюць матылькі (яны тут ёсць)? Ці там, дзе абстракцыі і фармальныя кампазіцыі?.. Шагалаўскія закаханыя ці металічныя «саджанцы»? Ці вось яшчэ — партрэт Скарыны, карціна алеем, стылізаваная пад лічбавы варыянт. І трыпціх у гонар біткоіна — у сярэбраным, залатым і плацінавым. Як мы хочам сябе бачыць і як у выніку бачым — вось тое пытанне, што чытаецца праз экспазіцыю. Адказ куратара — асобны твор, што таксама размясціўся на сцяне, прапісаны літарамі, дзе адзначаецца пошук форм, называюцца некаторыя імёны і кірункі, заўважаныя аўтарам тэксту, які не жыве ў Беларусі. Погляд збоку патрэбны. Калі погляд знутры становіцца не такі востры і пільны.

А на каго б звярнулі ўвагу вы?..

Ларыса ЦІМОШЫК



Крысціна Шчэмелева «Код Францыска».

Шуканні, якія нарадзілі асобу

Святло жывапісу Барыса Аракчэева



Выдадзена манаграфія, прысвечаная заслужанаму дзеячу мастацтваў Рэспублікі Беларусь Барысу Уладзіміравічу Аракчэеву (1926—2013).

Аўтар кнігі, якая пабачыла свет, — мастацтвазнаўца, культуролаг, сябра Беларускага саюза мастакоў Ксенія Сяліцкая-Ткачова. Назва — «Барыс Аракчэеў. Этапы вялікага шляху». Яшчэ зусім нядаўна да 90-годдзя яркага, шматаблічнага мастака быў рэалізаваны (у 2016—2017 гг.) маштабны культурны праект «Творчая дынастыя. Аракчэевы». Куратарамі гэтай сапраўды прыкметнай з'явы выступілі мастацтвазнаўца Ксенія Сяліцкая-Ткачова і дачка Барыса Уладзіміравіча — мастак Аксана Аракчэева. Прайшоў шэраг выставак, сустрэч, вечароў памяці, якія ладзіліся ў розных гарадах Беларусі.

Даследчыца жыцця і творчасці Барыса Аракчэева здолела паказаць у сваёй манаграфіі ўсё багацце творчай натуры мастака, яго непарушнае адзінства з рэалізмам і пастаянным пошукам новых шляхоў да выяўлення свайго аўтарскага «Я». Падзел разгляду зробленага Барысам Уладзіміравічам у выяўленчым мастацтве за дзесяцігоддзі на пэўныя перыяды носіць дастаткова ўмоўны характар. Мастацтвазнаўца хутчэй «перыядызуе», раскладвае на этапы ці перыяды шуканні творчай асобы. Пра гэта сведчаць і назвы раздзелаў манаграфіі: «Адлюстраванне жыцця і светапогляду савецкага грамадзяніна ў тэматычных карцінах Б. У. Аракчэева»; «Лірыка-драматычная настраёвасць пейзажных палотнаў як увасабленне аўтарскай і творчай пазіцыі майстра»; «Застылае хараство прыроды: зварот мастака да нацюрмортнага жанру»; «Гармонія знешняга вобліку і ўнутранага свету чалавека ў партрэтах Б. У. Аракчэева».

На старонках кнігі чытача чакаюць сустрэчы з вядомымі настаўнікамі героя манаграфіі, калегамі па творчай працы. Ксенія Сяліцкая-Ткачова звяртаецца да гісторыі стварэння асобных карцін Барыса Аракчэева, падрабязна і разам з тым лаканічна акрэслівае абставіны, акалічнасці, тую атмасферу, што адыграла важную ролю ў нараджэнні розных работ. Шкада, што манаграфія (а выйшла яна ў выдавецтве ПУП «Проня-Плюс») мае зусім невялікі наклад — усяго 70 асобнікаў. Узровень, на якім яна зроблена, якасць друку (а гэта асабліва важна ў выпадку, калі тэкст спалучаны з шырокім выкарыстаннем рэпрадукцый карцін Б. Аракчэева) — добры фундамент для пашырэння вядомасці таленавітага майстра беларускага жывапісу. А яшчэ — прыклад грунтоўнага разгляду творчасці аднаго мастака. Такога кшталту даследаванняў якраз і бракуе ў айчынным мастацтвазнаўстве.

Нагадаем, што спадчына таленавітага творцы захоўваецца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Беларускага саюза мастакоў, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага, Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П. В. Масленікава, Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-краязнаўчага музея-запаведніка, Баранавіцкага краязнаўчага музея, Крупскай мастацкай галерэі імя Барыса Аракчэева. А яшчэ — у прыватных калекцыях у Беларусі, Галандыі, ЗША, Італіі, Канадзе, Нарвегіі, Польшчы, Расіі, Украіне, Францыі, Чэхіі. Уражлівае падарожжа мастацтва па ўсім свеце!..

Кастусь ЛАДУЦЬКА

Прастора для яднання

2019 год аб'яўлены ў Расіі Годам тэатра. Што гэта дае нам? Самы час звярнуць увагу на моцныя расійска-беларускія тэатральныя сувязі. Як заявіў міністр культуры Беларусі Юрый Бондар, у найбліжэйшых планах не толькі гастролі тэатра імя Янкі Купалы ў Новасібірску, але і сталыя выступы на расійскіх сцэнах Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Максіма Горкага, паездкі на фестывалі ў Расію Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, музычнага тэатра і маладзёжнага.

Паводле звестак Белстата, лідарамі па наведвальнасці сярод правінцыйных тэатраў з'яўляюцца Гродзенскі тэатр лялек, Гомельскі драматычны, Магілёўскі абласны імя Дуніна-Марцінкевіча. У сувязі з гэтым дзіўным падалося тое, што нідзе не фігуруюць тэатры Брэста, хоць пра іх сувязі з Расіяй добра вядома.

НЕЗНАЁМЫ АСТРОЎСКІ

Нагадаем, што ў 2019 годзе Брэст аб'яўлены культурнай сталіцай СНД. 34 буйныя міжнародныя мерапрыемствы па культурным абмене чакае горад над Бугам. Адных толькі фестываляў у найбліжэйшы час запланавана тры. Ды яшчэ карнавал і парад аркестраў краін Садружнасці. Але вось цікавыя факты, якія датычацца тэатральнага жыцця. Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы ў красавіку з'ездзіў у Санкт-Пецярбург і ва Уладзімір. На традыцыйны фестываль рускамоўных тэатраў краін СНД і Балтыі «Сустрэчы ў Расіі» яны вазілі прэм'ерных «Нявольніц» па камедыі Аляксандра Астроўскага ў пастаноўцы маскоўскага рэжысёра Ягора Равінскага. Потым іграли ва Уладзіміры на Міжнародным тэатральным фестывалі «Тэатр. Тэрыторыя яднання».

Упэўненая, што нават адданыя знаўцы драматурга мала ведаюць пра гэтую п'есу. Яна амаль не ставілася ў Расіі і ніколі раней — у Беларусі.

З рускіх драматургаў мінулага ў нашай краіне, мабыць, самым папулярным заўсёды быў менавіта Астроўскі. У наш час яго, здавалася б, старамодныя п'есы пра купецтва і нараджэнне буржуазіі раптам сталі вельмі актуальныя. Рэжысёры ўдала іх асучаснiваюць, гледачы з задавальненнем глядзяць. У Астроўскага падкупляе глыбіня і бясконцасць універсальнага тэксту, вечная ў псіхалогіі сямейных адносін. Ён напісаў, здаецца, пра ўсё. Трэба толькі гэта ўбачыць.

Дастаткова хоць бы зірнуць на рэпертуар мінскіх тэатраў. «Праўда — добра, а шчасце — лепш» — у Рускім тэатры імя Максіма Горкага. «На ўсякага мудраца даволі прастаты», «Ваўкі і авечкі» — у тэатры-студыі кінаакцёра. «Шалёныя грошы» — у Новым драматычным. «Багатыя нявесты», «Беспасажніца» — у Маладзёжным тэатры. Па розных сцэнах падарожнічаюць музычныя і дзіцячыя спектаклі «Снягурка». Ці варта працягваць?...

Астроўскі напісаў «Нявольніц» незадоўга да смерці. Сам прызнаваўся: «Скончыў п'есу "Нявольніцы". Працаваў дзень і ноч і такі разбіты, што ледзь цягаю ногі. Напісаў за 35 дзён». Чаму так цяжка даўся драматургу гэты тэкст? Таму што пісаў ён пра новую гандлёвую і прамысловую буржуазію, пра яе бессардэчнасць і халодную ашчаднасць. Пагадзіцеся, праблема вельмі сучасная.

НЯМА ПРАРОКАЎ У СВАЁЙ АЙЧЫНЕ

Галоўным рэжысёрам Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы Цімафеем Ільеўскім зацікавілася Масква. Але гэта быў зусім не абмен рэжысёрамі.

Сцэна са спектакля «Нявольніцы».

У Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры імя Горкага ў красавіку адбылася прэм'ера «Апошні герой». Аўтар п'есы Цімафей Ільеўскі. Гадоў дваццаць таму яшчэ маладым рэжысёрам Ільеўскі пачаў пісаць п'есы і ўдзельнічаць у розных конкурсах. Праўда, схаваўся пад псеўданімам Іван Прыгонны. Удача доўга не прыходзіла. «Апошняга героя» ён паслаў адразу на пяць конкурсаў. Тэма пра канфлікт пакаленняў зацікавіла Эдуарда Баякова, толькі што прызначанага ў ММАТ імя Горкага — тэатр, вядомы як дзецішча Таццяны Даронінай. Тэатральны прадзюсар і галоўны рэжысёр даў дабро.

Дзіўна, што ні ў Беларусі, ні ў родным тэатры ў Брэсце творчасцю Ільеўскага дагэтуль не зацікавіліся.

ПРАСПЯВАЦЬ ТАБЛІЦУ МНОЖАННЯ

Выдатны расійскі кампазітар Рыгор Гладкоў стаў апекуном і заступнікам маладога незалежнага прыватнага тэатра «Тэрыторыя мюзікла» ў Беларусі. Музыка Гладкова гучыць у шматлікіх мультыплікацыйных фільмах, у сур'ёзным кіно і спектаклях. Кампазітар любіць прыязджаць з канцэртамі ў Беларусь. Вось як сам распавядае пра гэта: «Люблю Магілёў. Там нават дрэва ёсць — "Рыгор Гладкоў". Пасадзіў яго, калі быў на фестывалі "Залаты шлягер". Падабаецца драмтэатр, пешаходная вуліца, рака, прырода. Яшчэ па душы Мінск, Брэст. Неверагоднае месца — Полацк. Тут стаіць шар, які абазначае цэнтр Еўропы. Наогул люблю Беларусь. Галоўнае там — людзі. Дзіўныя. Прыгожыя. Быў неверагодна шчаслівы, калі прымусіў ўсю краіну вывучыць табліцу множання. Паклаў яе на музыку і праспяваў у дзевяці розных стылях: рок-н-рол, блюз, кантры, калыханка... Хацеў, каб дзеці засыналі, прачыналіся, танцавалі, збіралі партфель пад ненадакучлівую песеньку. І вывучвалі яе яшчэ да школы».

ВЕЛЬМІ, ВЕЛЬМІ МАЛЕНЬКІЯ

У мінскіх тэатрах шмат дзіцячых спектакляў. Часцей за ўсё гэта яркія і мудрыя рускія казкі. Адбылася прэм'ера ў Дзяржаўным тэатры лялек. Гэта свайго роду разыначка для дарослых. Рэжысёр Аляксей Ляляўскі, добра вядомы па сваіх пастаноўках у Расіі, выпусціў спектакль «Пушкін. Вельмі маленькія трагедыі».

Замахнуўся Аляксей Анатольевіч Ляляўскі на творчасць Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. І абраў для гэтага маленькія трагедыі, пра якія пажадаў весці вельмі просты аповед.

Чатыры гісторыі — «Скупы рыцар», «Моцарт і Сальеры», «Каменны госць», «Пір падчас чумы» — ва ўсе часы, на розных сцэнах і ў кіно разрасталіся з маленькіх трагедый у вельмі вялікія палотны. Ляляўскі пайшоў зваротным шляхам, скараціўшы іх да мяжы, ператварыўшы ў «вельмі маленькія трагедыі». Для гэтага вылучыў галоўныя грахі людзей — скупасць, зайздрасць, юрлівасць, блюзнерства. Гэта будзе напісана буйна, ярка, пакуль пойдзе аповед.

Хай не запалохвае жанр трагедыі. У рускім менталітэце, ды і ў беларускім таксама, прынята адначасова смяшыць свет і смяяцца з яго. Смех часам з'яўляецца як спроба пераадолець страх. Лічыцца, што тэатр лялек — малодшы брат тэатра драмы. Ва ўсіх казках меншы брат заўсёды быў не дурань і ўмеў абысці сваіх старэйшых сваякоў. Але лялькі больш сціплыя па фармаце. Ёсць дзяціннасць у характары тых, хто там працуе. Вось і ў спектаклі Ляляўскага афармленне мастака Таццяны Нерсісян сціплае: зверху спусціцца палка — арэлі на вяроўках. На ёй дзеянне адбываецца. Чалавечкі размаўляюць. Домікі-макеты з'явяцца. Акцёры (іх усяго чатыры) не хаваюцца, адкрыта водзяць лялек.

У «Скупым рыцары» ніякіх прыкмет эпохі феадальнага Сярэднявечча. Белы пухнаты хамячок з выразнай пысай у руках Уладзіміра Грамовіча ператвараецца ў млявага Барона. Пачынаюць гучаць пушкінскія радкі. Усяго толькі маналог героя пра ўладу грошай. Адкрые куфар, каб «жменю золата назапашанага ўсыпаць». Здаецца няшмат: «А колькі чалавечых клопатаў, // падманаў, слёз, малітваў і праклёнаў…»

Другая гісторыя «Моцарт і Сальеры» пра «двух сыноў гармоніі» шырока вядомая і разыграна буйнымі лялечнымі галовамі. У трэцяй трагедыі «Каменны госць» — тэма папулярная ў сусветнай літаратуры — легенда пра Дона Жуана. Тут з'яўляецца роставая лялька. Яе водзяць адразу два артысты.

Чацвёртая частка «Баль падчас чумы» перанесена ў сцены храма, што рамантуецца. Акцёры з'яўляюцца ў нішах. Адзенне сучасных рабацяг і не вельмі выразная думка рэжысёра. Тэатральны куфэрак аказаўся з сакрэтам. Асабіста мне ён не адкрыўся. Калі ў трох папярэдніх трагедыях было шмат лялечнага казачнага, то тут павеяла непрыязнай вуліцай. Малы фармат ёсць малы фармат. Пушкін шматаблічны, дадумвайце самі.

Рэжысёр не робіць скідкі на складанасць мовы трагедый. Тэкст вымаўляецца акцёрамі ў максімальна магчымым варыянце. Слухайце мелодыку пушкінскіх радкоў пра геніяў і бяздарнасці, псіхалогію чалавечага запалу. Ад мінулых стагоддзяў застаўся толькі пісаны каляровы заднік — прынт з выявай Страшнага суда.

«Жахлівае стагоддзе, жахлівыя сэрцы» — радкі, што сталі брэндам, як і іншыя: «Усе кажуць: няма праўды на зямлі // Але праўды няма і вышэй». Вядома, гэта адрасавана дарослым, але думаецца, школьнік, не зразумеўшы спектакль, захоча прачытаць Пушкіна ў тоўстым зборы твораў.

Такім чынам тэатр сапраўды яднае народы.

Таццяна АРЛОВА

Неверагодныя

«Прыгожыя спевы» Аксаны Волкавай і Настассі Масквіной у адмысловай праграме — рэдкая магчымасць пачуць іх разам, якую падараваў Вялікі тэатр напрыканцы мая. Ды яшчэ праграму дзівы склалі з урыўкаў твораў, якія рэдка выконваюцца на айчыннай сцэне, ды і наогул у свеце да іх звяртаюцца нячаста: у прыватнасці, гучаў дуэт Джаконды і Лауры з оперы «Джаконда» Амількарэ Панк'елі, арыя Манон з оперы «Манон Леско» Джакома Пучыні, раманс Медоры з оперы «Карсар» Джузэпэ Вердзі і іншыя. Ноты некалькіх твораў давялося заказваць і распісваць на аркестр спецыяльна для гэтага вечара.

Але галоўнае, што на сцэне — дзве выдатныя спявачкі з шыкоўнымі галасамі і незвычайнай музычнасцю, як адзначыў Джанлука Марчыяна, запрошаны галоўны дырыжор Вялікага тэатра Беларусі: «З Настассяй я ўжо працаваў у пастаноўцы "Лятучая мыш" Іагана Штрауса, дзе яна выконвае галоўную жаночую партыю. Настасся — спявачка, якая па-майстэрску выконвае як рэпертуар бельканта, так і больш цяжкія партыі. З Аксанай Волкавай гэта наша першая сумесная праца. Аксана спявае ў самых вядомых тэатрах свету. Яна, мабыць, з'яўляецца адной з самых лепшых Кармэн на сусветнай опернай сцэне, і, вядома, не толькі Кармэн… Яны неверагодныя».

Сапраўды, мецца-сапрана заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Аксаны Волкавай гучыць на самых славутых сцэнах: у Вялікім тэатры Масквы, «Метраполітэн-опера» ў Нью-Ёрку, у міланскім «Ла Скала» і лонданскім «Ковент-Гардэн». Сапрана народнай артысткі Беларусі Настассі Масквіной скарыла гледачоў Бельгіі, Германіі, Венгрыі, Вялікабрытаніі, Іспаніі, Нідэрландаў, Азербайджана падчас гастроляў нашага тэатра ў гэтых краінах. І нашы гледачы ведаюць, каго слухаць…

Марыя АСІПЕНКА

Экспрэсія слова

Поспех стужак часта абумоўлены плённым супрацоўніцтвам творчых тандэмаў: сцэнарыст — рэжысёр, рэжысёр — аператар

АЎТАРСКАЕ АСЭНСАВАННЕ

Такі творчы саюз склаўся ва У. Мароза разам са Станіславам Гайдуком і Мікалаем Князевым. У Мехава плённы творчы дуэт адбыўся з Юрыем Цвятковым. Над відэацыклам пра славутых беларусаў Мехаў працаваў разам з ім як са сцэнарыстам. Фільмы «Нарадзіўся я літвінам» і «Зорнае прыцягненне», створаныя ў аб'яднанні «Белвідэацэнтр», сталі новым этапам у своеасаблівым драматургічным вырашэнні гісторыка-культурнай тэмы. Карціны створаны на скрыжаванні навукова-папулярнага і дакументальнага кінематографа, калі галоўны ўпор зроблены на вербальнае выкладанне матэрыялу, што мае асноўную драматургічную нагрузку.

У фільме «Нарадзіўся я літвінам» (рэжысёр Я. Сяцько) экранная выява цалкам падпарадкавана славеснаму каментарыю. Часткова гэта абумоўлена матэрыялам самога фільма, звернутага да даўніны, ад якой застаўся не вельмі разнастайны іканаграфічны матэрыял. Героі стужкі — слынныя гістарычныя асобы: Тадэвуш Касцюшка, Адам Міцкевіч, Ігнат Дамейка, Напалеон Орда. Аўтары абапіраліся не толькі на ўнікальнасць іх жыццёвых і творчых шляхоў, але і на тое агульнае, што звязала гэтых розных асоб. Разлучаныя з Радзімай, яны шмат плённага зрабілі для культуры і навукі іншых краін. Іх дасягненні — вынік не толькі ўласнага таленту, але і любові да Радзімы. Менавіта гэта пачуццё дапамагала ствараць, пераадольваць цяжкасці з верай у росквіт роднай зямлі. Пры рабоце над сцэнарыем аўтары прапрацавалі мноства гістарычнага матэрыялу. Яны адразу адмовіліся ад стылістыкі навукападобнага выкладання, таму што для абодвух сцэнарыстаў гісторыя ў першую чаргу цікавая сваімі чалавечымі лёсамі з іх узлётамі, драмамі і непрадказальнасцю. Вербальны рад фільма спалучае змястоўны пазнавальны момант і яго вобразнае асэнсаванне, калі стыль гістарычнай публіцыстыкі арганічна пераплецены з эсэістыкай.

Героі карціны «Зорнае прыцягненне» — нашы суайчыннікі: ураджэнец Магілёва — вучоны Ота Шміт, які пакінуў след у розных галінах навукі, актыўны ўдзельнік «чалюскінскай эпапеі»; вядомы авіяцыйны канструктар Павел Сухі, які быў родам з Віцебшчыны; лаўрэат Ленінскай прэміі, актыўны ўдзельнік касмічнай праграмы Сямён Кросберг, ураджэнец Слуцка; Барыс Кіт — акадэмік Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі ў Парыжы, доктар філасофіі ў галіне матэматыкі і гісторыі навукі, ганаровы жыхар Навагрудка. Вобраз «зорнага прыцягнення» як выяўлення таленту беларусаў, абазначаны аўтарамі ў сцэнарыі і назве карціны, абумовіў арыгінальнае візуальнае рашэнне стужкі (рэжысёр М. Князеў). Абодва фільмы, знятыя рознымі рэжысёрамі, адрозніваюцца па жанры і стылі. Іх аб'ядноўвае ў цыкл не толькі тэма, але і канцэпцыя, асобаснае асэнсаванне, закладзенае ў драматургіі фільмаў.

КАШТОЎНАСЦЬ УЗАЕМАРАЗУМЕННЯ

Апроч гістарычнай тэматыкі, Юрыя Цвяткова як сцэнарыста цікавяць лёсы людзей са свету мастацтва, іх існаванне ў творчасці і грамадстве (відэафільмы «Адзіноцтва ў натоўпе. Мікалай Губенка» і «Юрый Тарыч. Пачатак»). У сцэнарыях Цвяткова адчуваецца яго рэжысёрская прафесія. Яны грунтоўныя, драматургічна афармленыя, з мноствам ідэй і дэталёва распрацаваныя.

Сцэнарыст Вера Ганчарова — адна з нямногіх прафесіяналаў па адукацыі (яна скончыла Усерасійскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі менавіта па спецыяльнасці «Кінадраматургія»). Падставай да стварэння сцэнарыя для Ганчаровай становіцца супадзенне актуальнасці, запатрабаванасці тэмы і ўнутранай зацікаўленасці. Так з'явіліся стужкі, прысвечаныя духоўным асобам — падзвіжнікам: «"...з забыцця і праху". Іаан Грыгаровіч» (аб протаіерэі Анічкавага палаца, гісторыку, археографу, складальніку першага зборніка «Беларускіх старажытных грамат»); «…І спазнай сэрца маё» (пра пастырскі подзвіг Паўліна, Архіепіскапа Магілёўскага і Мсціслаўскага, вядомага ў міру як Пётр Крошачкін і кананізаванага ў 2000 г.). Фільм «Родная душа», зняты ў Інфармацыйным агенцтве Беларускай праваслаўнай Царквы, змяшчае жыццяпіс ігумена Нікана (Вараб'ёва) — дасведчанага духоўніка і мудрага пастыра.

Ганчарова працавала над карцінамі разам з рэжысёрам Міхаілам Якжэнам. Іх аб'ядноўвае агульнасць светаўспрымання і эстэтычныя схільнасці; абодва кінематаграфісты ўдзяляюць шмат увагі візуальнай, музычна-гукавой, пластычнай культуры фільма. Можна яшчэ раз нагадаць пра каштоўнасць узаемапаразумення паміж усімі членамі здымачнай групы. Па агульным прызнанні, работа над фільмамі была «саборная»; усе члены здымачнай групы разам з аператарам (Павел Зубрыцкі) і гукааператарам (Сяргей Шункевіч) былі захоплены творчым пошукам. У выніку кожная з карцін вылучаецца эстэтычнымі вартасцямі; яны адзначаны шматлікімі ўзнагародамі. Але падаецца, што самай цэльнай і глыбокай стала стужка «…І спазнай сэрца маё». Незвычайная сама гісторыя яе з'яўлення. Унікальныя матэрыялы пра айца Паўліна перадаў Ганчаровай па ўласным жаданні Уладыка Максім, былы Архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі. І на працягу ўсяго здымачнага перыяду нечаканыя драматургічныя павароты былі звязаны менавіта з дапамогай і ўдзелам розных людзей. Гэтая невыпадковасць — вынік асабістых і прафесійных якасцяў Ганчаровай. Фільмы, знятыя па яе сцэнарыях, вылучаюцца культурай, інтэлігентнасцю і асаблівым позіркам на чалавека ў кантэксце духоўнага жыцця.

Над карцінай «Ад зараніц чэрвеньскіх…» Ганчарова працавала разам з рэжысёрам Уладзімірам Цеслюком на адным дыханні. Сцэнарый меў усяго тры старонкі, таму што паміж аўтарамі было поўнае ўзаемаразуменне. Унікальны хранікальны кінаматэрыял прапушчаны ў карціне праз аўтарскае стаўленне да ваеннага пакалення кінематаграфістаў. Гэту шчымлівую і эмацыянальную кінастужку Цяслюк прысвяціў свайму бацьку — франтавому кінааператару і яго сябрам, летапісцам Вялікай Айчыннай вайны.

Кадр з фільма «Кента, або Вялікай гульні малога шэфа».

СКАНЦЭНТРАВАНАСЦЬ НА ЧАЛАВЕКУ

Галіна Злабенка належыць да рэдкага тыпу ўніверсальных прафесіяналаў у сцэнарнай справе: з цікавасцю бярэцца за любую тэму, аператыўна ўключаецца ў работу. Яна мае вялікі досвед работы на «Тэлефільме», і часткова адсюль — яе дапытлівасць да разнастайных тэм і падзей, здольнасць наладжваць кантакты са сваімі героямі. Так, менавіта дзякуючы сцэнарысту разгаварыліся героі відэафільма «Зона. Асцярожна: дзеці…» (рэжысёр Р. Грыцкова) малалетнія парушальнікі Бабруйскай выхаваўчай калоніі. Іх экранныя споведзі ўзрушваюць незвычайнай для такіх падлеткаў шчырасцю.

Наогул, Злабенка любіць і паважае ўсіх сваіх герояў, што адлюстравалася нават у назвах работ: «Саната Надзеі» (рэжысёр Р. Грыцкова), «З табою мы здаўна родныя…» (рэжысёр В. Купрыянаў), «Чалавек справы» (рэжысёр С. Гайдук). Пры ўсіх гэтых якасцях яе аўтарская манера пазбаўлена залішніх эмоцый; найлепшыя кінастужкі, знятыя па сцэнарыях Злабенкі, вылучае стрыманасць і, галоўнае, сканцэнтраванасць на асобе чалавека.

Фёдар і Ягор Коневы (бацька і сын) прадстаўляюць два пакаленні прафесійных кінасцэнарыстаў. Спалучэнне багатага творчага вопыту старэйшага Конева з сучасным раскаваным падыходам Ягора далі плённы вынік. Відэафільмы «Васіль Быкаў. Франтавыя старонкі», «Летуценнік» (рэжысёр М. Якжэн), «Рамантык з Люцынкі» (рэжысёры М. Якжэн, Я. Сяцько), знятыя па іх сцэнарыях, сталі нешараговай з'явай на «Белвідэацэнтры». Апошнія карціны прысвечаны двум выбітным дзеячам беларускай культуры — пісьменніку Яну Баршчэўскаму і драматургу Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу. У фільме «Летуценнік», створаным на мяжы неігравога і мастацкага кіно, драматургія заснавана на творы Баршчэўскага «Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» — вобразным выніку шматлікіх назіранняў пісьменніка. Структура карціны «Рамантык з Люцынкі» больш складаная, сінтэтычная. У яе ўвайшлі асветніцкая і даследчая лініі, каментарыі спецыялістаў і ўрыўкі са спектакляў па творах Дуніна-Марцінкевіча.

Сцэнарыст Вера Савіна мае схільнасць да тэмы творчасці ў розных яе праяўленнях. Але найбольшую цікавасць для яе ўяўляе свет тэатра і жанр творчага партрэта. Відэафільм «Калі замоўкла Сегідзілья» прысвечаны славутай опернай спявачцы, народнай артыстцы Ларысе Александроўскай. Стужку здымалі да яе стагадовага юбілею. Жанр юбілейнага фільма абумовіў калажную драматургію з імкненнем умясціць у фільм як мага болей разнастайнай інфармацыі. Прынцыпова іншы драматургічны падыход здзейснены Савінай у тэлефільме «Тут. Цяпер. Сёння» (рэжысёр Зоя Катовіч). Гераіня стужкі драматург Алена Папова, вядомая за межамі краіны, прадстаўлена на экране ў незвычайным ракурсе. Сцэнарыст разам з рэжысёрам карціны паспрабавалі выявіць унікальнасць таленту і асобы сваёй гераіні праз мастацтва тэатра, складаны ўзаемаўплыў рэальнага і тэатральнага жыцця. Фільм здымалі на дачным участку Паповай, дзе была ўстаноўлена сапраўдная тэатральная сцэна. Тэатральныя акцёрскія маналогі з яе п'ес спалучаліся з паказам будзённых клопатаў жанчыны, маналогі рэжысёраў Мікалая Пінігіна і Віталя Баркоўскага — з цікавымі разважаннямі гераіні наконт жыцця і прафесійных праблем. Дакументальная і тэатральная стылістыкі арганічна суаднесліся, і ўсе ўдзельнікі фільма натуральна адчувалі сябе ў незвычайных умовах. Сярод мноства творчых партрэтаў гэты фільм вылучае не толькі арыгінальнасць формы, але і інтанацыя шчырасці, тонка перададзеная атмасфера творчасці.

АСАБІСТЫ КАМЕНТАР

Прыход Сяргея Трахімёнка, контрразведчыка, доктара юрыдычных навук, пісьменніка, у дакументальнае кіно сыграў вялізную ролю ў развіцці новага тэматычнага кірунку. Здарыўся той шчаслівы выпадак, калі прафесіянал валодае якасцямі таленавітага сцэнарыста. Сцэнарыі Трахімёнка звязаны з адкрыццём белых плям гісторыі мінулай вайны, у прыватнасці разведвальнай дзейнасці. Упершыню айчынны неігравы кінематограф звярнуўся да лёсаў нашых суайчыннікаў — людзей незвычайнай прафесіі, якая спалучала рамантызм і трагедыю. Герой «Кента, або Вялікай гульні малога шэфа» — рэзідэнт савецкай разведкі ў Бельгіі Анатоль Гурэвіч адсядзеў за свой подзвіг 12 гадоў і 46 гадоў чакаў рэабілітацыі. Да асобы Гурэвіча звярталіся расійскія кінематаграфісты, але ў іх работах адсутнічае тое каштоўнае, што ёсць у сцэнарыях Трахімёнка, — спалучэнне сенсацыйнага матэрыялу з драматызмам лёсу героя і эмацыянальнасцю яго спасціжэння аўтарам. Драматургія фільма ў часе здымак мянялася. Дзякуючы намаганням сцэнарыста ў фільме з'явілася лінія трагічнага кахання героя і яго сустрэчы з уласным сынам праз 50 гадоў. Трахімёнак стаў непасрэдным удзельнікам фільма. Менавіта яго аўтарскі каментарый-роздум у кадры надаў карціне асаблівую інтанацыю і глыбіню.

Фільм «Спадарожнікі "Сатурна"», у якім удзейнічае былы разведчык Аляксей Казлоў, не менш захапляльны і цікавы сваім псіхалагічным напружаннем. Абедзве стужкі зняты ў «Белвідэацэнтры» рэжысёрам Сяргеем Агеенкам. У творчасці рэжысёра гэтыя фільмы з ліку самых цікавых. Мужчынскі погляд на падзеі, аналітычнасць і харызма Трахімёнка спалучыліся з вобразным рэжысёрскім вырашэннем. У фільме «Кент, або Вялікая гульня малога шэфа» выкарыстана рэдкая архіўная хроніка, музыка А. Шнітке і вершы І. Бродскага. Ва ўсіх карцінах, знятых па сцэнарыях Трахімёнка (відэафільм «Трохі смялейшы за іншых», рэжысёр Л. Скварцова; кінафільм «Успамінаючы Чарняхоўскага», рэжысёр С. Лук'янчыкаў і інш.), праяўляецца аўтарская індывідуальнасць. Яна адбіваецца не толькі ў драматургіі, але і ў імкненні спасцігнуць таямніцу пакалення непераможных.

Герой карціны «Трохі смялейшы за іншых…» — пісьменнік, двойчы Герой Савецкага Саюза Уладзімір Карпаў уражвае не толькі харызмаю, жыццялюбствам і мудрым асэнсаваннем трагічных падзей уласнага лёсу. Аўтары разам са сваім героем паспрабавалі зразумець падспудныя, асноватворныя матывы чалавечага быцця ў экстрэмальных, экзістэнцыяльных абставінах вайны і асэнсаваць тэму патрыятызму, мужнасці чалавека без пафасу і дэкларатыўнасці.

Сучасныя тэндэнцыі неігравога кінематографа выявіліся ў тэндэнцыі адыходу ад вербальнага каментарыя, што звязана з імкненнем да ўніверсальнасці ўспрымання. Але менавіта слова з яго экспрэсіяй надае дакументальным фільмам асаблівую інтанацыю і стылістыку. Імкненне стварыць мастацкі дакумент рэальнасці, адмовіцца ад вербальнага раду выклікае мноства праблем на ўзроўні драматургічнага і змястоўнага рашэння. У фільмах, створаных у рэчышчы аўтарскага кіно, асабісты рэжысёрскі каментар падкрэслівае індывідуальнасць аўтарскага стылю. У стужках Віктара Аслюка ён сугучны яго мінімалісцкай стылістыцы; у Міхася Жданоўскага — адлюстроўвае філасафічнасць рэжысёра; стрыманая эмацыянальнасць характэрная для закадравага каментара Галіны Адамовіч. Вербальны рад экалагічных стужак Ігара Бышнёва па стылістыцы нагадвае прозу Міхаіла Прышвіна з яе вобразна-філасофскім асэнсаваннем.

Галіна ШУР

Дам я вам песню…

Песні і мары ў новай праграме Аляксандра Віслаўскага «Тутэйшы» на словы Янкі Купалы

Паэзія Янкі Купалы стала крыніцай натхнення для многіх беларускіх кампазітараў. За амаль 80 гадоў з дня трагічнай гібелі паэта не толькі вершы Купалы, але і сама яго постаць набылі нейкую сакральную значнасць. Шмат увасабленняў паэзія Песняра мела ў беларускай музыцы. Але сапраўднае адраджэнне цікавасці да творчасці Купалы пачалося ў другой палове 1970-х гадоў дзякуючы Уладзіміру Мулявіну і ансамблю «Песняры». Выдатны творца, Мулявін першы перанёс паэзію Купалы на эстраду, увасобіўшы не толькі ў песнях, але і ў творах буйных формаў. Сапраўдным адкрыццём для меламанаў былі ў свой час прэм'еры рок-оперы У. Мулявіна «Песня пра долю» паводле паэмы Янкі Купалы «Адвечная песня» (1976), паэмы-легенды «Гусляр» І. Лучанка — У. Мулявіна паводле купалаўскага «Кургана» (1978) і песеннага цыкла У. Мулявіна на вершы Купалы «Я нясу вам дар». «Песняры» далі вядомасць такім незабыўным песням на вершы Купалы, як «Спадчына» Ігара Лучанка, «Явар і каліна» Юрыя Семянякі, «Я не паэта» Уладзіміра Мулявіна і мноству іншых. Песня «Малітва» Алега Молчана ў выкананні Мулявіна стала духоўным гімнам Беларусі.

Цалкам заканамерна, што цікавасць да творчасці Янкі Купалы перадалася ў спадчыну многім музыкантам «Песняроў», якія працягвалі і працягваюць самастойную кар'еру па-за межамі ансамбля. У 1993 годзе выдатны музыкант і кампазітар «Песняроў» Ігар Палівода стварыў на вершы Купалы песенны цыкл «Беларушчына» для Нацыянальнага аркестра эстраднай і сімфанічнай музыкі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Прэм'ера гэтага выдатнага твора адбылася ў 1993 годзе ў Маладзчне падчас II Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі. У 2016 годзе яшчэ адзін вядучы калектыў краіны — Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Беларусі імя І. Жыновіча пад кіраўніцтвам Міхаіла Казінца — прэзентаваў у Белдзяржфілармоніі цалкам новы песенны цыкл на вершы Янкі Купалы «Малітва» яшчэ аднаго вядомага «песняра» і паплечніка Уладзіміра Мулявіна — Алега Молчана. Дадам у гэты пералік альбом «Шчаслівасць» з песнямі БДА «Песняры» 2011 года — каб зрабіць выснову, што паэзія Янкі Купалы ў беларускай песні, здаецца, вычарпана да донца. Але гэта, як аказалася, зусім не так! Нядаўна ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы сваю аўтарскую праграму «Тутэйшы» на вершы Купалы прадставіў яшчэ адзін былы «пясняр» Аляксандр Віслаўскі.

Ён працаваў у ансамблі «Песняры» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Мулявіна з 1987 па 1991 гады піяністам, аранжыроўшчыкам і бэк-вакалістам, але, як расказваў падчас вечарыны, калі хто-небудзь з асноўных спевакоў раптам выходзіў з шыхту, спяваў за іх усе сольныя нумары і быў «універсальным салдатам». А і праўда: універсальнасць вызначала амаль усіх музыкантаў ансамбля «Песняры», якія адначасова спявалі, іграли на розных інструментах, аранжыравалі і стваралі музыку. Выключныя музычныя здольнасці разам з вялізным досведам, напрацаваным Аляксандрам Віслаўскім у «Песнярах» і іншых калектывах (напрыклад, у вядомай беларускай рок-групе «*Rouble Zone*»), даюць значны творчы плён. Праграма «Тутэйшы» — не першая вялікая кампазітарская праца Віслаўскага. Некалькі гадоў таму ў музеі Янкі Купалы ён паказваў цыкл песень «Маленне за Беларусь» на вершы Рыгора Барадуліна. Ёсць у яго і іншыя значныя аўтарскія работы, у якіх ён выступае як спявак і аранжыроўшчык, пры гэтым падчас запісу трэкаў іграе практычна на ўсіх інструментах: ад клавіш да бас-гітары і перкусіі. Так было гэтым разам. Партыі ўсіх інструментаў ён прапісваў асабіста. Выключэнне — акустычная скрыпка, на якой іграе яго жонка і пастаянная партнёрка Алена Віслаўская.

Цэнтральная музейная зала з бронзавай скульптурай Янкі Купалы ў куце была запоўнена цалкам. Перад пачаткам канцэрта многія са здзіўленнем разглядалі найноўшыя сучасныя клавішныя інструменты, усталяваныя на невялічкай прасторы ўмоўнай сцэны каля помніка паэту. Калі Аляксандр на іх зайграў, адразу ж стала заўважна яго тэхнічнае майстэрства. А калі заспяваў, многія ўжо не маглі стрымаць эмоцый. Так рэдка пачуеш цяпер на эстрадзе спевакоў з прыгожымі і чыстымі галасамі! А ў Віслаўскага — звонкі драматычны тэнар, свежы і малады. Нездарма ён усё ж працаваў у лепшым ВІА СССР.

— Адзін беларускі кампазітар, калі даведаўся, што я працую над праграмай па Купале, заўважыў: «А што цяпер шукаць у Купалы? Мы ж усё, што можна, на яго вершы напісалі!» — распавёў музыкант. На што я адказаў яму: «Вы, можа, і напісалі. А я — не!».

Спадчына Янкі Купалы настолькі ўсёабдымная і шматгранная, што кожны творца здольны адшукаць усё новыя тэмы і вобразы, нават калі асобныя вершы ўжо раней былі пакладзены на музыку. У Віслаўскага сваё стаўленне да Купалы. Ён робіць акцэнт на творах, што звязаны з духоўным пачаткам. Як вядома, Аляксандр з'яўляецца хрысціянскім прапаведнікам і ў розных краінах свету разам з жонкай Аленай выступае як хрысціянскі выканаўца. Увогуле, у праграме з васьмі песень Аляксандр Віслаўскі ў сваёй музыцы адлюстроўвае пераважна невядомыя, а дакладней — «незапетыя» вершы Купалы. Часам рэдагуе асобныя словы і радкі, што бывае часта ў музыкантаў, калі яны шукаюць музычныя вобразы да паэтычных строфаў. І разам з паэтам ставіць пытанні веры («Дам я вам слоўца», «Тутэйшы»), любові да роднай зямлі, усведамлення сваёй непарыўнай сувязі з ёй («Я ад вас далёка», «Калыханка», «Песня мая»), сяброўскага стаўлення і шанавання людзей іншых краін і веравызнанняў («Памяці Шаўчэнкі», «Жыды»), прагі сацыяльных змен у грамадстве і заклік змагацца за вольную Беларусь («Прарок»). Усе песні адмыслова сплецены ў цэласны аповед, які мае сваю драматургію. Віслаўскі цікава гуляе з музычнымі жанрамі і сумяшчае блюз, рок-н-рол, баладныя формы, спалучае беларуска-ўкраінскі мелас і тэмы, навеяныя брадвейскімі шоу. Усе песні ён спяваў з вялікай аддачай і натхненнем, удала канферыраваў перад выкананнем кожнага нумара і стварыў цёплую сяброўскую атмасферу, якая ўзмацнялася своеасаблівым «эфектам прысутнасці» Янкі Купалы. Ці спадабаліся яму песні Аляксандра Віслаўскага?.. Смею выказаць меркаванне, што адказ на гэта пытанне мог бы быць бясспрэчна станоўчы. Уся праграма напісана і праспявана шчыра і натхнена, яе з вялікім энтузіязмам прыняла публіка, сярод якой былі музыканты, паэты, літаратары і ўвогуле — знаўцы беларускай паэзіі і песні.

Аляксандр Віслаўскі.

Цыкл «Тутэйшы» — адметная з'ява ў музычным мастацтве Беларусі, яшчэ адзін зварот да паэзіі Янкі Купалы як сведчанне яе бязмежнасці. Важна і тое, што да твораў Купалы дакранаюцца таленавітыя творцы, для якіх галоўнае — зрабіць працу па жаданні сэрца, нават калі яна не прыносіць фінансавых дывідэндаў, а хутчэй наадварот. Бо песні на вершы Янкі Купалы ў наш прагматычны час ніколі не стануць камерцыйным прадуктам. Але шчасце, што ёсць яшчэ ў Беларусі сапраўдныя рамантыкі накшталт Аляксандра Віслаўскага, якія ствараюць гэтыя песні, нягледзячы ні на што. Бескарыслівыя творцы — цяпер як тыя прарокі, пра з'яўленне якіх марыў Янка Купала. Яны ёсць. Іх сэрцамі і талентам жыве Беларусь.

Вольга БРЫЛОН

Гімн Зэльвеншчыне на «Сакавінах»

Свята паэзіі і музыкі «Зэльвенскія Сакавіны» бярэ свой пачатак у 1997 годзе. Тады вядомы беларускі паэт Уладзімір Мазго першы раз завітаў на сваю малую радзіму ў якасці паважанага госця літаратурнай імпрэзы. Праз дзясяцігоддзі свята набыло папулярнасць дзякуючы арганізатарам — супрацоўнікам раённай бібліятэкі — і ўдзелу знакамітых паэтаў і пісьменнікаў, артыстаў і крытыкаў, якіх запрашаў Уладзімір Мінавіч. Сёлета аўтар «Гімна Зэльвеншчыне» адзначыў 60-годдзе і падзяліўся ўзнёсласцю з землякамі.

Гэтым разам на «Зэльвенскіх Сакавінах» была магчымасць паслухаць, як нараджаюцца вершы і песні. Так, Уладзімір Мінавіч раскрыў аўдыторыі свой сакрэт: першыя паэтычныя радкі ён пісаў, ідучы праз сасновы лес са школы дамоў. Дарога да Бярэжак, дзе жыла сям'я Мазго, была няблізкая, таму атрымліваліся і вершы. Зэльвенцы ж пабачылі першы паэтычны твор пятнаццацігадовага вучня на старонках раённай газеты «Праца». Праз жыццё пісьменнік нясе любоў да Бацькаўшчыны, да беларускай мовы, ён аўтар шматлікіх паэтычных зборнікаў, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

А яшчэ — і класік песенна-паэтычнай творчасці, лічыць лаўрэат прэміі Саюзнай дзяржавы, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, кампазітар і выканаўца Алег Елісеенкаў. Паэт і артыст сябруюць больш чым 25 гадоў. Нагодай для знаёмства стала музыка. Алег Мікалаевіч напісаў ноты і вельмі хацеў, каб хтосьці прыдумаў словы. Але ў аўтараў, да якіх звярнуўся, атрымалася не вельмі гладка. І тады ён прапанаваў Уладзіміру Мазго. Праз два дні з'явіўся цудоўны твор «Святло малітвы» альбо «Косы твае», які спяваюць Валерый Дайнека, Дзмітрый Качароўскі. На гэты раз песня мілагучна загучала са сцэны ў выкананні самога аўтара. А потым яшчэ адзін твор — «Вочы дзяцей».

Не абышлося без прэм'еры. Госці прапанавалі зэльвенцам першымі ацаніць сумесную работу паэта, кампазітара і выканаўцы — песню «Жаўруковая мова». Зала старалася падпяваць прыгожыя радкі: «Кожным гукам чароўным і словам / Зноў табою акрылены я. / Беларуская мова, / Наша з небам размова, / Жаўруковая песня мая».

Зараз Уладзімір Мазго працуе намеснікам рэдактара ў часопісе «Нёман». Дзе толькі ні друкаваліся яго вершы: у «Полымі» і «Маладосці», нават у часопісе «Родная прырода». Ён быў пераможцам не аднаго конкурсу, мае прэстыжныя прэміі — імя Васіля Віткі, «Залаты Купідон», узнагароджаны медалём Францыска Скарыны. А сёлета — падзячнае пісьмо старшыні райвыканкама і прапанова настаўнікаў СШ № 2 стаць асобай сацыяльнага праекта «*Neo Boomaga*» і дазволіць ім выдаць зборнік вершаў Мазго на паперы з трыснягу.

Вялікі талент пісаць як на беларускай, так і рускай мовах, думаць і ствараць у рытме паэзіі, працаздольнасць Уладзіміра Мазго адзначыў намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда», галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Аляксей Чарота, які прысутнічаў у якасці госця на свяце. У выдавецкі дом «Звязда» ўваходзіць шэраг выданняў, Аляксей Іванавіч прапанаваў маленькім зэльвенцам, якія маюць паэтычны талент, дасылаць свае першыя спробы пяра ў «Бярозку», больш старэйшым — у «Маладосць» ці «Полымя».

Самадзейныя артысты Зэльвеншчыны таксама даказалі, што свята «Сакавіны» ў іх — адно з любімых. Яно жыве і мае працяг — на розных сцэнічных пляцоўках, на маштабных раённых мерапрыемствах, у іншых канцэртных праграмах.

Людміла ПОПКА

Скарбонка Спадчыны

Фота Альфрэда Міхуса.

Неба, абрынься дажджом!

Маланкі-стрэлы і металічныя ахвяры Перуну

Паводле астранамічнага календара, лета распачнецца ўжо заўтра, 1 чэрвеня. А вось традыцыйны каляндар у многіх мясцовасцях з гэтым не згодны. Так, на Веткаўшчыне, у вёсках Казацкія Балсуны і Стаўбун, здаўна вераць: лета пачынаецца толькі пасля таго, як будзе паводле ўсіх правілаў праведзены старажытны абрад ваджэння і пахавання Стралы. Ён і ў нашы дні штогод ладзіцца мясцовымі аўтэнтычнымі фальклорнымі калектывамі з удзелам даследчыкаў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, навукоўцаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі і ўнесены ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны краіны.

Гэтая святочная дзея адбываецца на Ушэсце, праз 40 дзён пасля Вялікадня (сёлета 7 чэрвеня), з мэтай засцерагання вёскі ад маланкі і абароны новага ўраджаю. Мясцовыя вераць, што калі добра «павадзіць стралу», паспяваць песні, то неба можа «абваліцца дажджом», а калі добра «пакачацца» парамі па жытнёвым полі, ураджай будзе вельмі багаты, а самі ўдзельнікі святкавання — здаровыя ўвесь год.

Магчыма, гэта зусім і не павер'е, бо даследчыкі традыцыйнай культуры беларусаў, што ўжо шмат гадоў удзельнічаюць у свяце, прыгадваюць: раней, калі «стрэлы» збіралі многа жанчын, якія спявалі і вадзілі карагоды, энергетычны напал быў настолькі моцны, што нават неба не вытрымлівала і абрыналася вялікім дажджом.

У абрадзе ваджэння і пахавання Стралы ўдзельнічаюць толькі жанчыны. Мужчыны могуць далучацца да шэсця па вёсцы, аднак спяваць, вадзіць карагоды яны права не маюць. Менавіта жаночая энергетыка на свяце лічыцца галоўнай. Яна, як сіла Зямлі, здольная засцерагаць, спрыяць росту і ўрадлівасці. Ды і ў песнях, што спяваюцца падчас «стралы», у асноўным распавядаюць сюжэты з жаночага жыцця. Гэта і песня-дыялог, у якой маленькай дзяўчынцы загадваюць загадкі, каб праверыць, ці стане яна разумнай жанчынай і добрай жонкай, і гісторыя пра тое, як маладзіца «скакала й плясала» і згубіла ключы, якія потым знайшоў «стары чорт» ды стаў яе мужам, і сумны расповед, як жонка атруціла свайго мужа...

Зрэшты, у нашы дні, праз стагоддзі пасля таго, як гэтыя песні былі створаныя, складана патлумачыць іх семантыку. Гэта проста формула-зварот, распрацаваная некім прадбачлівым і захаваная яго нашчадкамі. Нам жа застаецца толькі слухаць, спяваць ды запамінаць.

Так, у дзень правядзення абраду святочна адзетыя жанчыны збіраюцца ў цэнтры вёскі. Яны ідуць невялікімі групкамі, па дарозе спяваюць песні і водзяць кагароды. У месцы збору ўтвараецца агульны вялікі карагод, удзельніцы кажуць словы-заклінанні, спяваюць, потым выстройваюцца ў шэрагі — наперадзе грамады стаяць старэйшыя жанчыны — і гучным шэсцем з песнямі ідуць па вёсцы да жытнёвага поля.

Тут — новая частка абраду. Песні і карагоды ў жыце, «качанне» па полі — каб набрацца сіл ад Зямлі, а таксама перадаць ёй частку ўласных жыццядайных уласцівасцяў. Кожная ўдзельніца абраду павінна зрабіць у глебе невялічкую ямку і закапаць металічны прадмет як ахвяру Перуну. Звычайна гэта манеткі. Існуе таксама меркаванне, што падчас прынясення ахвяры можна загадаць жаданне — і Пярун яго выканае! Лічыцца, што гэтыя металічныя прадметы стануць пэўнага кшталту громаадводамі на ўвесь сезон і будуць абараняць усю вёску ад навальніц, грому і маланак.

Таксама падчас абраду жанчыны вырываюць па дзевяць жытнёвых каласкоў. Існуе павер'е, што высушаныя за іконай, яны прынясуць здароўе, дабрабыт і багаты ўраджай.

Сярод навукоўцаў не існуе адзінага меркавання, што насамрэч варта называць «стралой». Стрэлы ў дадзеным кантэксце — гэта і карагоды, што водзяць падчас свята масцовыя жанчыны, і тыя металічныя прадметы-ахвяры, якія яны закопваюць у полі падчас правядзення абраду. Таму і кажуць, што ў гэты дзень стралу і водзяць, і хаваюць.

А вось калі ўсе рытуальныя дзеянні выкананыя, карагоды праведзеныя, ахвяры-стрэлы закапаныя, жаданні загаданыя, да абраду могуць далучацца мужчыны. Яны з жартамі і смехам распачынаюць рытуальные «качанне» ў жыце. Адметна, што ў Стаўбуне прынята не проста падбегчы да жанчыны і «пакаціць» яе па полі, трэба спачатку насмяшыць ці зрабіць «качанне» часткай жарту. Так і цэлы год пройдзе весялей.

Марына ВЕСЯЛУХА

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
30.05.2019 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 1129

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 1669

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.